КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 27 (250) ◂ 8 ліпеня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**ЖУРНАЛІСТ НА СВАБОДЗЕ**

Стар. 6

**ДЫФУЗНАЯ НЕЗАДАВОЛЕНАСЦЬ**

Хто ўчора быў увасабленнем дабра, сёння ўспрымаецца як абсалютнае зло

Стар. 4

**АМІНА — ПРАЕКТ «МАСАДА»?**

Каб дыскрэдытаваць палітычныя рухі, сакрэтныя службы пачынаюць ствараць фальшывыя блогі лесбіянак і гомасэксуалістаў

Стар. 11

**МАЛАЯ РАДЗІМА АКАДЭМІКА КАРСКАГА**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**СЯРГЕЙ ДРАЗДОЎСКІ**

Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Трэці сектар у асобах»

▸ З НАГОДЫ

# КАЎБАСНЫ КОШТ СВАБОДЫ

Вольга ХВОІН

**Тэатр аднаго акцёра ў Дзень Незалежнасці — так празвалі інтэрнэт-карыстальнікі парад і паказальнае шоў — скончыўся збіцём, затрыманнямі соцень людзей і святочным салютам.**

Хаця ў Міністэрстве ўнутраных спраў і заявілі, што на парад прыйшлі амаль 150 тысяч чалавек, у рэальнасці колькасць гледачоў была ў разы меншая — вольныя месцы на трыбунах, рэдзенькія групы людзей уздоўж праспекта сведчылі хіба што пра тысяч дзесяць гледачоў. Дажджы ці агульны невясёлы настрой не спрыялі жаданню народа паглядзець на ваенную моц Беларусі і галоўнакамандуючага ў кампаніі яго малодшага сына, апранутага ў вайсковую форму.

На гэты ж дзень, 3 ліпеня, мадэратары суполкі «Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі» планавалі «марш мільёнаў» — вулічную акцыю мірнага пратэсту. Але заклікі «захлопаць» апладысментамі прамову Лукашэнкі поспеху не мелі — прыхільнікаў негвалтоўнага супраціву на гэтую дзею прыйшло, відавочна, мінімум, ды і людзі ў цывільным пільна сачылі за аматарамі пляскаць у далоні. У выніку нават сябры праўладнага БРСМу не рызыкнулі ацаніць урачыстае дзеянне бурнымі авацыямі. Маўклівы парад крызіснага часу. Да слова, на прэтэнзіі, што не час цяпер траціць грошы на масавае забаўлялава, у Мінабароны супакоілі: кошт параду — сто тон самай таннай каўбасы.





У сваёй прамове галоўнакамандуючы Аляксандр Лукашэнка гаварыў пра бессэнсоўнасць «аранжавых рэвалюцый». «Мы разумеем, што мэта гэтых нападаў — пасеяць няўпэўненасць і трывогу, разбурыць грамадскую згоду. У канчатковым выніку, паставіць нас на калені і звесці да нуля ўсе заваёвы незалежнасці. Гэтаму не бываць! — грымеў лідар дзяржавы. — Мы выстаім і сёння! Пераадолеем любыя цяжкасці і годна вытрымаем навязанае нам выпрабаванні. Таму што чэрпаем сілы з невычэрпнай крыніцы трагедыі нашага народа — смелага воіна і сумленнага працаўніка».

Самае цікавае адбывалася не ў час, калі паказвалі «танец трактара-дзяўчынкі і трактара-хлопчыка», а вечарам, каля прывакзальнай плошчы. Сотні людзей сабраліся там, каб маўчаннем і апладысментамі выказаць сваю нязгоду з дзеяннямі ўладаў. Аналагічныя акцыі адбываліся ў абласных, раённых гарадах. У Магілёве, па словах відавочцаў, на маўклівы пратэст выйшлі больш за тысячу чалавек — самая буйная за апошнія гады акцыя. Але скончылася ўсё даволі хутка: праваабаронцы гавораць, што ў Дзень Незалежнасці ў Беларусі затрымана не менш за 390 чалавек — прыкладна 210 чалавек у Мінску, каля 180 — у рэгіёнах. Затрыманых па адміністрацыйных пратаколах каралі вялікімі штрафамі і «суткамі» — ад трох да пятнаццаці.

У сталіцы разгон і затрыманні мірных грамадзян суправаджаліся не толькі прымяненнем грубай фізічнай сілы брытагаловымі людзьмі ў цывільным, але і распыленнем слезацечнага газу. Асабліва пастараліся крэпкія хлопцы без апазнавальных знакаў з журналістамі — ім газ з балончыкаў пырскалі наўпрост у твар (ёсць шэраг фотаздымкаў з доказамі гэтага «доблеснага» ўчынку), білі, ламалі тэхніку.

У негвалтоўных акцыях пратэсту, «акцыях апладысментаў» ёсць новая рыса, прынамсі так было ў Мінску. Мінакі з крыкамі «Міліцыя, дапамажыце!» спрабавалі адбіць людзей у невядомых у цывільным, якія валаклі, цягнулі, вялі да аўтазакаў і аўтобуса без нумарных знакаў уладаў. Жанчына, якая была на акцыі з мужам і дзіцём, істэрычна крычала пра падаражанне дзіцячых тавараў, памперсаў, пра тое, што цяпер яна не можа з дзіцём на вуліцы гуляць «у ладушкі».

На заўтра карыстальнікі сацыяльных сетак пачалі вывешваць фотаздымкі невядомых, якія найбольш адзначыліся ў брутальных затрыманнях. Распаўсюд такой інфармацыі дазваляе хутка апазнаць ананімных ахоўнікаў парадку, у выніку галоснымі становяцца імя, прозвішча, хатнія адрасы, кантактныя тэлефоны, месца вучобы ці працы. Трэба сказаць, што рэакцыя на ўжо апазнаных «герояў» была надзвычай негатыўнай.

Адміністратар групы *«ВКонтакте»* «Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі» Вячаслаў Дыянаў у цэлым станоўча ацаніў акцыю мірнага супраціву 3 ліпеня: «Мы не чулі апладысментаў Лукашэнку. Калі гаварыць пра вячэрнюю акцыю, то бачна, што ўлады нас баяцца, з кожным разам міліцыя ўсё больш жорстка разганяе людзей. Улады разумеюць, што змагаюцца з нечым новым, гэта не знікне. Мы напраўду будзем працягваць нашыя акцыі надалей. У сеткавай рэвалюцыі складана знайсці арганізатара. І калі на вуліцы б'юць мірных грамадзян, гэта ўплывае на свядомасць». Вячаслаў Дыянаў падкрэслівае, што хаця падчас вулічных праменадаў і не агучваюцца лозунгі аб змене ўлады, менавіта гэта і ёсць асноўнай ідэяй. «Гэта заўсёды намі агучвалася», — падкрэслівае адміністратар інтэрнэт-суполкі, які цяпер жыве ў Варшаве. Дыянаў не супраць, калі лідарства падхопіць нехта з народу ці з прафесійных палітыкаў. «Калі з'явяцца лідары, будзе новы ўзровень арганізацыі, то можна будзе прамаўляць ідэі на вуліцы. Каму давярыцца народ, той у выніку і будзе лідарам», — пераканаўны Вячаслаў Дыянаў.

На беларускі Дзень Незалежнасці прыйшла хуткая міжнародная рэакцыя. Напрыклад, старшыня Еўрапарламента Ежы Бузэк, адкрываючы сесію парламента ў Страсбургу, заявіў, што беларускія ўлады «мусяць неадкладна і безумоўна выпусціць усіх дэманстрантаў, затрыманых у выніку мірнай акцыі пратэсту, якая прайшла ў Мінску ў нядзелю». «Мы пільна сочым за развіццём падзей у Беларусі. Еўрапарламент падтрымлівае грамадзян краіны ў іх імкненні да свабоды слова і сходаў», — перадае ІТАР-ТАСС словы Ежы Бузэка.

ПРАВА

# НЕ ПУСЦІЛІ АДВАКАТА

**5 ліпеня ў калоніі ў Горках Магілёўскай вобласці да палітвязня Змітра Дашкевіча не пусцілі адваката Змітра Лаеўскага.**



У адміністрацыі калоніі спаслаліся на тое, што Зміцер Дашкевіч нібыта не пісаў заявы пра сустрэчу з адвакатам.

«Я адправіла Змітру некалькі тэлеграмаў, каб ён напярэдадні падаў такую заяву. Мяркую, гэтыя тэлеграмы альбо не дайшлі да адрасата, альбо адміністрацыя калоніі свядома іх знішчыла», — кажа намесніца старшыні зарэгістраванай у Чэхіі грамадскай арганізацыі «Малады фронт», Наста Палажанка.

У горацкай калоніі ў адваката Лаеўскага не ўзялі заяўку на сустрэчу з падабаронным і не далі яму пісьмовага тлумачэння адмовы. Паводле звестак, адвакат Зміцер Лаеўскі накіраваўся ў Магілёў, каб падаць у абласную пракуратуру скаргу на дзеянні адміністрацыі калоніі.

Лідару «Маладога фронту» Змітру Дашкевічу прысудзілі 2 гады зняволення нібыта за хуліганства. Інцыдэнт адбыўся за дзень да прэзідэнцкіх выбараў, 18 снежня 2010 года. «Малады Фронт» звязвае затрыманне Дашкевіча і Лобава напярэдадні выбараў з правакацыяй спецслужбаў. У калонію ў Горках Змітра Дашкевіча прывезлі ў чэрвені, і неўзабаве стала вядома, што актывіст трапіў у карцэр. Прычыны пакарання карцэрам і стан здароўя Дашкевіча невядомыя.

АКЦЫЯ

# СТРАХ СЫХОДЗІЦЬ

**6 ліпеня прайшла чарговая «Маўклівая рэвалюцыя». Гэтым разам людзі выходзілі на вуліцы сваіх гарадоў не толькі да цэнтральных плошчаў, але і да буйных грамадска-культурных аб'ектаў.**

Мірная акцыя зноў скончылася масавымі брутальнымі затрыманнямі. Дарэчы, цяпер асаблівую пільнасць людзі ў цывільным праявілі да журналістаў — па ўсёй краіне былі затрымання ажно 25 работнікаў пяра, мікрафона і камеры.

У Мінску здарыўся жахлівы ў сваёй абсурднасці выпадак. Ля Нацыянальнай бібліятэкі пажылога чалавека гіцлі ў цывільным давялі да хваравітага прыступы, але не толькі не выклікалі хуткую, але і зрабілі выгляд, што яны былі не пры чым. «Я не тупаў, не крычаў, не міргаў, я проста сядзеў», — расказаў Уладзімір Марозаў БелаПАН. Тым не менш, да пенсіянера і яго знаёмых такога ж узросту падышлі двое ў цывільным і папрасілі сысці. У сваю чаргу, Уладзімір Марозаў папрасіў іх прадставіцца. «На гэтым размова скончылася і паступіла каманда хапаць і цягнуць мяне ў аўтобус», — сказаў пенсіянер.

Уладзімір спрабаваў папярэдзіць тых, хто нападаў, што ён інвалід і ў яго хворае сэрца. Але мужчыны працягвалі цягнуць пенсіянера ў аўтобус. «Гэта былі сапраўдныя бандыты», — не вытрымаў Уладзімір Марозаў. Паводле яго словаў, у нейкі момант ён страціў прытомнасць, але бандыты ў пагонах не дазволілі навакольным нават выклікаць хуткую дапамогу. Калі ён ачуняў, побач былі мінакі, якія дапамаглі яму дайсці да прыпынку і пасадзілі ў таксі. «Але я ж не тэрарыст, я не забойца, я пенсіянер, — сказаў Марозаў. — За што весь так мяне? Хачу спытаць таго байца, які мяне душыў: сынок, за што ты мяне душыў?»

Паводле інфармацыі праваабаронцаў, усяго за час правядзення «маўклівых рэвалюцый», арганізаваных «Рэвалюцыяй праз сацыяльныя сеткі», што адбываліся ў Беларусі 15, 22 і 29 чэрвеня, а таксама 3 і 6 ліпеня, было затрымана каля 1 730 чалавек. З іх у Мінску — 980.

Большую частку затрыманых пакаралі арыштамі і штрафамі. Многіх адпускалі з РАУСаў пасля здачы адбіткаў пальцаў і папярэджанняў. Многія былі збітыя.

Гэтыя дадзеныя не канчатковыя, бо сабраць поўную інфармацыю праваабаронцы магчымасці не маюць з-за закрытасці судоў і адсутнасці спісаў затрыманых.

Грамадзяне краіны арганізавалі і добраахвотны збор грошай на выплату штрафаў людзям, якіх затрымлівалі за апладысменты на вуліцах гарадоў. Калі вы гатовыя дапамагчы ў аплаце штрафаў затрыманым падчас акцыяў маўклівага пратэсту, звяртайцеся, калі ласка, на Управу БНФ па адрасе: горад Мінск, пр. Машэрава, 8 (былая вул. Варвашэні, 8). Сабраныя грашовыя сродкі будуць перададзеныя ў праваабарончы цэнтр «Вясна».

ФОРУМ

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПЛАТФОРМА ФГС

Генадзь КЕСНЕР

**У Мінску 5 чэрвеня прайшла канферэнцыя Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства. Падчас канферэнцыі прадстаўнікі дзясяткаў грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў з розных рэгіёнаў Беларусі падсумавалі вынікі працы за апошні год і абмеркавалі свае далейшыя дзеянні, а таксама вызначыліся з прапановамі наконт удзелу беларускага боку ў Трэцім Форуме ГС УП, які 28–30 лістапада адбудзецца ў Познані (Польшча).**

Як адзначыў сустаршыня ФГС УП Улад Вялічка, за мінулы час мелі месца шэраг негатыўных з'яваў, што да дзейнасці Нацплатформы ГС і сітуацыі ў Беларусі ўвогуле. Напрыклад, прыпынена праца Нацплатформы ў фармаце Дарожных мапаў, практычна адсутнічае актыўнасць грамадскіх арганізацый у рамках тэматычных працоўных груп, няма агульнай стратэгіі дзейнасці прадэмакратычных сіл у сучасных умовах, што склалася ў краіне.

«Нацыянальная платформа не выступае актыўным суб'ектам дзеянняў, не прапануе шляхоў выхаду з сітуацыі», — канстатаваў ён.

Тым не менш, па словах сустаршыні ФГС УП, мелі месца і станоўчыя, канструктыўныя моманты ў дзейнасці Нацыянальнай платформы: у снежні 2010 — чэрвені 2011 гадоў ладзілася публічнае абмеркаванне Стратэгіі «Мы адзін народ» як магчыма грунту для кансалідацыі прадэмакратычных сіл Беларусі, у красавіку прайшла канферэнцыя «Роля і месца грамадзянскай супольнасці ў стратэгіі будучыні» на базе Нацыянальнай платформы ФГС УП.

Кіраўнік Цэнтра еўрапейскай трансфармацыі Андрэй Ягораў адной з найбольш актуальных праблем для экспертаў назваў «адсутнасць суб'екта, з якім улады пагадзіліся б весці перамовы». Ён лічыць, што эфектыўным было б аб'яднанне палітычных суб'ектаў з суб'ектамі арганізаванай грамадзянскай супольнасці і тымі сіламі, якія сёння выступаюць у выглядзе спантаннай грамадскай актыўнасці. Іншыя ўдзельнікі канферэнцыі таксама прытрымліваліся меркавання, што ўсе гэтыя сілы маглі б змусіць улады пайсці на дыялог.

Удзельнікі канферэнцыі абралі грамадскія арганізацыі, што будуць рэкамендаваны для ўдзелу ў Трэцім Форуме грамадзянскай супольнасці УП у Познані. Заяўкі ж падавалі 80 структур, у тым ліку і праўладныя Саюз пісьменнікаў Беларусі, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі ды некаторыя іншыя. Сярод тых, каго рэкамендавалі на паездку ў Познань, значыцца трыццаць адна грамадская структура, у тым ліку Беларуская асацыяцыя журналістаў, Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, Беларускі Хельсінскі камітэт, Фонд імя Льва Сапегі, Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў, Офіс па правах людзей з інваліднасцю ды іншыя — як добра вядомыя грамадскія арганізацыі, так і зусім «маладыя» структуры.

Канчаткова ж вырашаць, хто прыме ўдзел у Трэцім Форуме ГС УП, будзе Кіраўнічы камітэт Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства пры ўдзеле Еўрапейскай Камісіі.

ФОРУМ

# БЕЛАРУСКІ ШТОГАДОВІК–2010

Генадзь КЕСНЕР




**Зборнік аглядных і аналітычных матэрыялаў па развіццю сітуацыі ў Беларусі ў 2010 годзе «Беларускі штогадовік» прэзентаваны 5 лютага ў сталічнай «Галерэі «Ў». Укладальнікамі зборніка з'яўляюцца Беларускі інстытут стратэгічных даследаванняў (BISS, Літва) і сайт экспертнай супольнасці *«Наше мнение»*.**

«Беларускі штогадовік» ёсць доўгатэрміновым калектыўным праектам экспертнай супольнасці Беларусі. Гэта выданне ўяўляе сабою штогадовы комплексны аналіз становішча ў найважнейшых сегментах дзяржавы і грамадства. У працы над «Штогадовікам» узялі ўдзел незалежныя аналітыкі і эксперты, спецыялісты, якія прадстаўляюць розныя даследніцкія цэнтры, як то Беларускі інстытут стратэгічных даследаванняў (Літва), Інстытут палітычных даследаванняў «Палітычная сфера», даследніцкі цэнтр Інстытута прыватызацыі і менеджменту, Агенцтва гуманітарных тэхналогій, Лабараторыя аксіяметрычных даследаванняў «НОВАК», Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД, Літва), Беларускі эканамічны даследча-адукацыйны цэнтр (BEROC), Цэнтр усходніх даследаванняў (Польшча), аналітычны цэнтр «Палескі фонд міжнародных і рэгіянальных даследаванняў» (Украіна), Даследніцкі цэнтр «eBelarus».

Сярод аўтараў «Штогадовіка» вядомыя беларускія журналісты і эксперты — Анатоль Панькоўскі, Канстанцін Скуратовіч, Барыс Тасман, Андрэй Фёдараў, Уладзімір Роўда, Сяргей Нікалюк, Уладзімір Дунаеў, Максім Жбанкоў, Марына Акулава ды іншыя.

Паводле ўкладальнікаў і аўтараў, «Штогадовік» закліканы, з аднаго боку, стымуляваць публічныя дыскусіі наконт трансфармацый і шляхоў развіцця краіны, а з іншага — быць карысным у працы дзяржаўных функцыянераў, бізнэс-менеджараў, прадстаўнікоў дыпламатычнага корпуса, журналістаў, палітычных і грамадскіх дзеячаў.

Рэдактар выдання Валерыя Касцюгова адзначыла, што апошні год для аўтараў і ўкладальнікаў «Штогадовіка» стаўся крайне цяжкім. «Мы зведалі спусташальныя асабовыя страты: падчас працы над «Штогадовікам» памёр дырэктар BISS Віталь Сіліцкі, які, уласна, каардынаваў працу выдання, а таксама адзін з старэйшых і самых любімых аўтараў «Штогадовіка» Аляксандр Грыцанаў. Але год быў вельмі цяжкім не толькі таму: за гэты час, пасля падзей 19 снежня, Беларусь пазбавілася надзеі на эвалюцыйны пераход», — мяркуе Валерыя Касцюгова.

ПРАЕКТ

## ДЫЯЛОГ

Цэнтр міжкультурнага дыялогу пры падтрымцы Пасольства Злучаных Штатаў Амерыкі ў Рэспубліцы Беларусь з удзелам Міжнароднага фонду «Залатая спадчына Віцебска» і Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі распачынаюць рэалізацыю міжнароднага праекта «Беларуска-амерыканскі культурны дыялог: стратэгія развіцця».

Першым этапам праекта стане абвяшчэнне і правядзенне адкрытага конкурсу «Амерыканская культура: якая яна?» у дзвюх намінацыях: «Чым прывабная амерыканская культура?» і «Уклад беларусаў у развіццё амерыканскай культуры».

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ХАПУНІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСІ

Генадзь КЕСНЕР

**Выбрыкі невядомых у цывільным штотыдзень сталі звыклай з'явай у сённяшняй рэальнасці Сінявокай. Судовыя канвееры, затрыманні і гвалт у дачыненні да незалежных журналістаў, сітуацыя, калі хапаюць нават цэлымі сем'ямі, прыводзіць да яшчэ больших пратэстаў, і не толькі ў самой Беларусі, але і па-за яе межамі. Тым часам ад таго, што сілавікі са скуры лезуць, каб выканаць загады вышэйшай улады па «недапушчэнню беспарадкаў», кошты ў крамах не зміншаюцца, а валюты ў абменніках не прыбаўляецца.**

Падаецца, што «хапуны», зладжаныя асобамі напаўкрымінальнага выгляду з поўнай падтрымкай «афіцыйна аформленых» ахоўнікаў правапарадку, робяцца такім жа атрыбутам беларускай сталіцы, як вежа Эйфеля ў Парыжы ці яе «падаючая» сястра ў італьянскай Пізе. Не стала выключэннем і перадкупальская серада, 6 ліпеня, калі сацыяльныя сеткі зноў абвясцілі акцыі «маўклівага пратэсту», а ўлады чарговым разам вырашылі іх прадухіліць. Натуральна, так, як яны гэта ўмеюць, то бок, з гвалтам, аўтазакамі, лаянкамі і беспрычынным паляваннем на суграмадзян, некаторыя з якіх нават уцяміць не могуць, за што ж іх хапаюць дзецюкі-шафы ў цывільным, абкладваюць мацюкамі і шпурляюць у «аўтазакі» — таксама новы масавы атрыбут беларускіх гарадоў. Вось, у Вілейцы бравыя міліцыянты, ці хто там яшчэ, затрымалі нават… сабаку! Відаць, збрахнуў нешта антызаконнае, небарака чатырохлапы, а тыя ўсё зразумелі і, верагодна, «дзейнічалі ў адпаведнасці з узніклай сітуацыяй». Малайцы!

Зноў дасталася карэспандэнтам недзяржаўных выданняў. Як паведамляе сайт Беларускай асацыяцыі журналістаў, хапалі нашых калег як у сталіцы, так і ў іншых гарадах. Прычым карэспандэнту афіцыйна акрэдытаванага ў Мініфармацыі «Еўрарадыё» Андрэю Елісееву пры затрыманні парвалі журналіцкае пасведчанне. На ўласнай скуры адчулі «пяшчоту» тутэйшых змагароў за грамадскі парадак фотакарэспандэнт «Белгазеты» Вадзім Заміроўскі (ужо каторы раз!), каля Нацыянальнай бібліятэкі затрымалі карэспандэнта «Радыё Свабода» Алега Груздзіловіча, а на вуліцы Прытыцкага каля Лядовага палацу — журналіста «Нашай Нівы» Ягора Марціновіча і фотажурналіста Антона Матольку (tut.by). Затрыманай аказалася і сябра Праўлення БАЖ Алена Якжык, іншыя журналісты, хапалі іх таксама ў Гродна, Наваполацку, Баранавічах, Магілёве, Бабруйску…

Так званыя «праваахоўнікі» ніяк не могуць зразумець, што журналісты таксама выконваюць свае прафесійныя абавязкі, калі знаходзяцца на сацыяльна важных мерапрыемствах ці масавых акцыях, нават несанкцыянаваных, і гэта правa ім гарантавана, у тым ліку, і Законам «Аб СМІ». Гэтым «праваахоўнікам» прасцей выканаць дубовы загад начальства ці нават праявіць звярыную ініцыятыву, збіць, зняважыць і паламаць тэхніку, чым прачытаць заканадаўчыя акты, якія ніхто пакуль яшчэ не адмяняў.

Дарэчы, 7 ліпеня споўнілася 11 гадоў, як у раёне Нацыянальнага аэрапорту «Мінск» знік без вестак аператар расійскага тэлеканалу РТР, сябра БАЖ Зміцер Завадскі. Дагэтуль нічога не вядома пра лёс журналіста (справу абвінавачанага ў дачыненні да выкрадання Завадскага Ігнатовіча і кампаніі пакінем па-за ўвагай), а тыя, хто па сваім прызванні і ў звязку з прафесійнымі абавязкамі павінен быў бы займацца рэальным пошукам зніклага, ганяюцца за мірнымі грамадзянамі па плошчах і завулках. Вось якая, аказваецца, цяпер галоўная функцыя тых, чыя служба *«и опасна, и трудна»*. Толькі вось пра плён сваёй дзейнасці распавядзіце, панове, маці ды ўдаве Змітра! А вось калегі Дзімы апоўдні 7 ліпеня запалілі ў сваіх рэдакцыях знічкі…

Тым часам не перастае здзіўляць сваім аптымізмам кіраўнік беларускага ўраду. У сераду Міхаіл Мясніковіч зрабіў чарговую «сенсацыйную» заяву пра тое, што сітуацыя на валютным рынку павінна стабілізавацца ў найбліжэйшы час. «У маі мы спрацавалі ўпершыню за многія гады са станоўчым знешнегандлёвым сальда ў 120 мільёнаў долараў па ўсіх відах дзейнасці — па таварах і паслугах. Такім чынам, выраўноўваецца плацежны баланс, і гэта сведчыць пра тое, што, магчыма, у найбліжэйшы час мы забяспечым стабілізацыю на валютным рынку», — заспакойвае беларускі прэм'ер. Яго б словы ды вядома каму ў вушы!

Але ж як быць са знешнімі пазыкамі, сукупны памер якіх пасля атрымання 800 мільёнаў долараў крэдыту ад Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС склаў 32,5 мільярда долараў?! І што меў на ўвазе паважаны Міхаіл Уладзіміравіч, калі казаў пра стабілізацыю на валютным рынку? Што долары-еўры разам з расійскімі рублікамі ў абменніках малітвамі Мясніковіча і астатніх урадаўцаў з нацбанкаўцамі намалююцца? Ну не будзе гэтага. Таму што не збіраецца кіраўніцтва краіны і Нацбанку рабіць лагічныя і апраўданы эканамічна крок — зрабіць абменны курс такім, якім ён мае быць, а не дырэктыўным, бо не пяць тысяч беларускіх фантаў каштуе сёння амерыканскі «зялёны», а 6200–6500 і 9000 — еўра. А на валютныя інтэрвенцыі дзеля падтрымання курсу айчыннага рубля Нацбанк сёння не адважыцца, таму і не з'явіцца валюта ў абменных пунктах. Так што са «стабілізацыяй» на валютным рынку і Мясніковічу, і шараговым беларусам давядзецца пачакаць. Як прагназуюць незалежныя эканамісты, сама мала да студзеня наступнага года.

«Узрадаваў» днямі і намеснік Міхаіла Мясніковіча Анатоль Калінін, калі ў Пінску распаўсюдзіў навіны пра новыя тарыфы на праезд у грамадскім транспарце і аплату камунальных паслуг. Як вынікае са слоў віцэ-прэм'ера, сказаных ім на сустрэчы з працоўным людам у мясцовым аўтобусным парку, у жніўні і верасні кошт на праезд, магчыма, можа расці на сто рублёў штомесяц. Тарыфы на паслугі пасажырскага транспарту (гарадскія і прыгарадныя пасажырскія перавозкі аўтамабільным, гарадскім электрычным, унутраным водным транспартам і метрапалітэнам) будуць паслядоўна павышацца да ўзроўню, які забяспечвае пакрыццё да канца 2011 года 70% выдаткаў на іх аказанне. У 2012 годзе ўзровень тарыфаў на паслугі грамадскага транспарту павінен будзе пакрываць не менш за 85% выдаткаў на аказанне тых паслуг, у 2013-м — не менш за 90%.

Таксама, па словах Калініна, вырастуць і кошты на камунальныя паслугі. Пасля падвышэння ўзровень аплаты грамадзянамі паслуг ЖКГ павінен дасягнуць 30% ад сабекошту. Агульна на ўсе віды ў грашовым вымярэнні рахункі вырастуць у сярэднім на 100 тысяч рублёў, прычым ужо да канца бягучага года. Напачатку падаражэюць цеплаэнергія, газ і вада, потым вываз цвёрдых бытавых адходаў, ліфт і іншыя задавальненні. У прыватнасці, тарыфы на ЖКГ для насельніцтва будуць паслядоўна павышацца да ўзроўню, які забяспечыць пакрыццё за кошт сродкаў насельніцтва не менш за 30% выдаткаў на іх аказанне ў 2011 годзе, 35% — у 2012 годзе, 40% — у 2013 годзе. Пры гэтым пакрыццё насельніцтвам выдаткаў па асобных відах жыллёва-камунальных паслуг, а таксама іх звышнарматыўнага спажывання будзе даведзенае да ўзроўню іх сабекошту.

А вось апроч разавых кампенсацый і неістотнага падвышэння пенсій ды стыпендый, ніякіх шчыраванняў у бок насельніцтва ўрад болей не прадугледжвае. Бо ўлады Беларусі дзеля крэдыту Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС абавязаліся «замарозіць» рост заробкаў ды іншых дзяржаўных выдаткаў. Так што рыхтуйся, народ! Цяпер застаецца маліцца, каб зіма не была сцюдзёнай, а свет не абрынуўся ў новы крызіс. Бо тады эканоміцы Сінявокай дакладна і канчаткова будзе хана, а пра перспектывы рэалізацыі і росквіту «ўнікальнай беларускай мадэлі» будуць разважаць не дзяржаўныя эканамісты з афіцыйнымі прапагандыстамі, але медыкі пэўнай спецыялізацыі ды гумарысты, прычым не тутэйшыя.

> Вырастуць і кошты на камунальныя паслугі. Пасля падвышэння ўзровень аплаты грамадзянамі паслуг ЖКГ павінен дасягнуць 30% ад сабекошту. Агульна на ўсе віды ў грашовым вымярэнні рахункі вырастуць у сярэднім на 100 тысяч рублёў, прычым ужо да канца бягучага года

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### РЫГОР ВАСІЛЕВІЧ

Генпракурор Беларусі Рыгор Васілевіч заявіў, што супрацоўнікі праваахоўных органаў, якія забяспечваюць грамадскі парадак, павінны карэктна ставіцца да ўдзельнікаў супрацьпраўных дзеянняў, па магчымасці прадстаўляцца і растлумачваць грамадзянам наступствы невыканання заканадаўства. З агаворкай: калі дазваляе сітуацыя. «Супрацоўнікі праваахоўных органаў, прымаючы меры па забеспячэнню грамадскага парадку, самі таксама абавязаны няўхільна выконваць дзеючае заканадаўства, у тым ліку ведамасныя акты, быць максімальна карэктнымі. Папярэдне, калі дазваляе сітуацыя, трэба прадстаўляцца і патрабаваць ад грамадзян спынення супрацьпраўных дзеянняў, растлумачваць заканадаўства і наступствы яго невыканання», — заявіў генпракурор у заяве, размешчанай на сайце Генеральнай пракуратуры з нагоды арганізуюцца акцый збору грамадзян на вуліцах і ў іншых грамадскіх месцах.

Васілевічу хацелася б, каб «грамадзяне выкарыстоўвалі законныя спосабы вырашэння праблем, а арганізатары разумелі, што яны таксама нясуць адказнасць за свае правакацыйныя дзеянні». «Мяркую, што пытанні эканамічнага характару могуць вырашацца не на разбуральнай, а на канструктыўнай аснове. Усе разумныя ідэі, рэалізацыя якіх прагназуема, пажадана ўспрымаць пазітыўна», — сказаў генпракурор.

Ён падкрэсліў, што «парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах ва ўсіх краінах цягне юрыдычную адказнасць, напрыклад, адміністрацыйную, у тым ліку ў Беларусі». Але ці ёсць адказнасць для людзей у цывільным, якія сярод белага дня выкрадаюць людзей на вуліцы і вязуць іх у пастарункі, збіваюць падчас затрыманняў, перашкаджаюць працы журналістаў — б'юць іх, пырскаюць у вочы слёзацечны газ, ламаюць тэхніку — генпракурор нічога вырашыў не гаварыць.



### ПАВЕЛ ЛАТУШКА

Міністра культуры Павел Латушка раскрыў сакрэт беларускай кінаіндустрыі — толькі 7% бюджэтных сродкаў, якія ўкладваюцца ў праекты нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», вяртаюцца назад дзяржаве.

«На сённяшні дзень перад намі стаіць задача павелічэння долі вяртання тых сродкаў, якія ўкладвае дзяржава, ад продажу канкрэтных кінакарцін», — цытуе словы міністра БелаПАН. Паводле меркавання Латушкі, у бліжэйшы час «рэальна выйсці на 30% вяртання сродкаў, якія ўкладвае дзяржава». У будучым гэтая велічыня будзе залежаць ад таго, наколькі запатрабаванай стане беларуская кінапрадукцыя на ўнутраным і знешнім рынках.

Павел Латушка паведаміў, што да 2014 года плануецца, у прыватнасці, стварыць «канкурэнтны асяродак у кінасферы Беларусі», больш эфектыўна выкарыстоўваць дзяржаўныя сродкі, накіраваныя на падтрымку кінавытворчасці, развіць прадзюсаванне, дзяржаўна-прыватнае партнёрства і прыватны кінапракат, пашырыць пералік падатковых ільгот, а таксама павялічыць колькасць сумесных міжнародных праектаў.

З пачатку года ў краіне прапрацоўваецца восем кінапраектаў сумесна з расійскімі кампаніямі, два праекты — з кампаніямі Еўрасаюза. Латушка растлумачыў, што беларуска-расійскія праекты ўяўляюць сабой у асноўным тэлесерыялы, якія «паказваюць найбольшую эфектыўнасць з пункту гледжання вяртання сродкаў».

Супрацоўніцтва з кінасферай ЕС будзе завязана на праектах гістарычнай тэматыкі.



### НАДЗЕЯ АСТАПЧУК

Надзея Астапчук — беларуская штурхальніца ядра — падчас спаборніцтваў у Расіі паказала лепшы вынік сезона ў свеце.

Надзея Астапчук на мемарыяле братоў Знаменскіх у расійскім Жукоўскім выйграла спаборніцтвы па штурханні ядра і паказала лепшы вынік сезона ў свеце — 20 м 94 см. Беларуска Алена Копец была пятай — 17 м 64 см. У спаборніцтвах па скачках у даўжыню Анастасія Міронччык-Іванова заняла трэцяе месца з вынікам 6 м 75 см.

У французскім Сотвілле ў актыве беларусаў чатыры ўзнагароды. Павел Крывіцкі стаў лепшым сярод кідальнікаў молата — 77 м 2 см, а Юрый Шаюнаў паказаў другі вынік — 75 м 71 см. Два медалі заваявалі лёгкаатлеткі ў спаборніцтвах па бегу на дыстанцыі 800 метраў — Марына Арзамасава фінішавала другою, а Святлана Усовіч заняла трэцяе месца.

▸ АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ДЫФУЗНАЯ НЕЗАДАВОЛЕНАСЦЬ

Сяргей НІКАЛЮК

**Ад любові да нянавісці — адзін крок, таму той, хто яшчэ ўчора быў увасабленнем дабра, можа сёння ўспрымацца як абсалютнае зло.**




Чалавек не ў стане жыць без трох рэчаў: вады, ежы і міфаў. З вадой і ежай усё зразумела, але для чаго homo sapiens — так званаму чалавеку разумнаму — патрэбныя міфы, якая яму ад іх карысць?

Міфы абараняюць розум чалавека ад перанапружання шляхам спрашчэння рэальнасці. Бліснула, напрыклад, маланка і грымнуў гром, але ў народа няма пытанняў. Гэта Зеўс-грамоўнік угневаўся. Неабходна прынесці яму ахвяру — і можна плысць далей, не раздзіраючы свой розум сумневамі з нагоды сапраўднай прыроды гэтай грознай нябеснай з'явы.

Развіццё навукі не адмяніла масавай патрэбы ў міфах. Працаёмкая гэта справа — па бібліятэках бегаць. Жыццё кароткае, і радасцю пазнання спіс даступных чалавеку задавальненняў не абмяжоўваецца. Таму лозунгу «Больш міфаў добрых і розных!» дэвальвацыя не пагражае. Актуальны ён і сярод прафесійных аналітыкаў, якія перыядычна забаўляюцца пошукам карэляцыі паміж узроўнем прыбыткаў беларусаў і іх схільнасцю да палітычнага пратэсту.

## Voice і exit

Пра тое, што такая карэляцыя існуе ў жывой прыродзе, нам перыядычна нагадваюць тэлерэпартажы з «гарачых кропак». Геаграфія іх шырокая і не абмяжоўваецца краінамі з незавершанай мадэрнізацыяй. Сёння акцыі пратэсту захлынулі радзіму дэмакратыі — Грэцыю. У мінулым годзе на плошчы выходзілі мільёны абураных французаў.

У краінах Паўночнай Афрыкі дэманстрантаў не спыняюць ні дубінкі, ні кулі. Лік ахвяр ідзе на тысячы. У такога жорсткага супрацьстаяння ёсць свая прычына. Яно магчыма толькі ў грамадствах з невысокай вартасцю чалавечага жыцця. Такімі, у прыватнасці, з'яўляюцца грамадствы, што знаходзяцца «ў стадыі хуткага перасялення сельскага насельніцтва ў гарады» (Міхаіл Дзмітрыеў, палітолаг). Беларусы-гараджане гэту стадыю мінулі ў гады пасляваенных пяцігодак, таму калі яны і здольныя на пратэст, то выключна ў негвалтоўных формах. Іншая справа — прадстаўнікі сілавых структур, сярод якіх гараджан у другім пакаленні можна па пальцах пералічыць.

З Паўночнай Афрыкай разабраліся. Паспрабуем зараз разабрацца з нядзельнасцю беларусаў-гараджан канкураваць з грэкамі і французамі. Фармат «Азбукі паліталогіі» патрабуе чарговай цытаты. У маёй камп'ютарнай калекцыі файл «цярпенне-пратэст» адзін з самых аб'ёмных. Пачну з публіцыста Марата Гельмана: «Як рэагуюць індывіды або цэлыя краіны на крызісы? Паводле Альберта Хіршмана, ёсць дзве асноўныя мадэлі: «пратэст» (voice) і «сыход» (exit). Пратэст — гэта актыўнае процідзеянне крызісным з'явам, спроба з імі змагацца... Сыход — гэта выхад у нейкае іншае вымярэнне, у іншую прастору, эміграцыя, нарэшце».

Пра папулярнасць сярод беларусаў «сыходу» нам увесь час нагадваюць сацыёлагі НІСЭПД. У сакавіку бягучага года пра сваю гатоўнасць пераехаць у іншую краіну на сталае месца жыхарства заявілі 45% рэспандэнтаў. У спрыяльным 2006 годзе колькасць антыпатрыётаў была істотна ніжэйшая — 34%. Эканамічная падаплёка такога зруху відавочная. Сакавіцкае апытанне было праведзена да пачатку праблем з набыццём наяўнай валюты. Не здзіўлюся, калі сёння колькасць ахвочых выехаць на ПМЖ перавысіць палову. Зразумела, што сярод антыпатрыётаў пераважаюць маладыя людзі (65% у сакавіку).

Замацуем тэму «сыходу» яшчэ адной цытатай: «Разумееце, у нас механізм пратэсту крыху іншы, чым, напрыклад, у Польшчы. Нашай культуры ўласцівыя формы пратэсту, калі актыўныя і нязгодныя людзі заўсёды папросту сыходзяць з зоны дзеяння непрымальных для іх нормаў. Так, напрыклад, фармавалася казацтва — спачатку прыгонныя беглі на Поўдзень, потым у Сібір. Цяпер у нас сыход на Захад. Калі ёсць магчымасць сысці, з'ехаць чыста фізічна, то сацыяльна актыўная частка насельніцтва сыходзіць, і база для актыўнага пратэсту мінімізуецца» (Наталля Ціханава, сацыёлаг).

«У нас» — гэта ў Расіі. А ў нас, у Беларусі, эканамічна актыўныя грамадзяне сотнямі тысяч збягаюць за межы «беларускай эканамічнай мадэлі развіцця», у тым ліку і ў Сібір. Пра гэта я пісаў у папярэдняй «Азбуцы паліталогіі».

## Алкагалізм як сродак адаптацыі

Не савецкаму чалавеку, у адрозненне ад прыгоннага селяніна, бегчы было куды. Для пратэсту нават у форме сыходу неабходна альтэрнатыва, якой будаўнік камунізму быў цалкам пазбаўлены. Пазбаўлены ён быў і крытэраў для незадаволенасці. Апошняе заўсёды адносна. Таму для фармавання незадаволенасці патрэбныя ўзоры, якія дазваляюць чалавеку суаднесціць сапраўднае з жаданым. Адсюль «жалезная заслона». Без яе разбурэння была б немагчымая *«величайшая катастрофа XX века»*. Рэкамендую чытачам «НЧ» перагледзець фільм «Брыльянтавая рука». Ён якраз пра гэта.

Здольнасць беларуса трываць, калі меркаваць па шматлікіх анекдотах, — важная рыса нацыянальнага характару. Звернемся за тлумачэннем да сацыёлага Льва Гудкова: «Чаму гэта так важна, што трыванне становіцца адным з элементаў самаідэнтычнасці? Што гэта за такая ананімная сіла, якая дзейнічае з пастаяннымі высілкамі ды прымушае пакутаваць і пераносіць штосьці відавочна дрэннае? Гэта, зразумела, не надвор'е, не клімат. Гэта сацыяльныя акалічнасці арганізацыі жыцця, якія абарочваюцца ўсведамленнем сябе як аб'екта чужога і негатыўнага ўздзеяння, адмова ад уласнай волі. Вы разумееце, што тут адбываецца інверсія негатыўных рысаў ва ўласныя пазітыўныя вартасці?»

Беларус у якасці «чалавека цярплівага» канчаткова сфармаваўся ва ўмовах прымусовай савецкай аднадушнасці. Пазбаўлены легітымнай магчымасці выяўляць незадаволенасць, ён у адказ на пагаршэнне свайго матэрыяльнага становішча тужэй зацягваў пояс. Гэта значыць, аддаваў перавагу не стратэгіям пратэсту і сыходу, а стратэгіі пасіўнай адаптацыі, якая зніжае асабістыя запыты. Але паніжэнне асабістых запытаў нават у форме бытавога рэчызму — гэта прамы шлях да дэградацыі асобы.

Алкагалізацыя насельніцтва — толькі адзін з індыкатараў дэградацыі асобы. Крытычную норму, якая складае, па дадзеных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, 8 літраў чыстага алкаголю на сярэднестатыстычнага жыхара, беларусы даўно пераскочылі. Пракаментую сказанае афіцыйнай статыстыкай: «Продаж лікёра-гарэлачных вырабаў у 2009 годзе ў параўнанні з 2008-м павялічыўся на 14,4%, слабаалкагольных напояў — на 3,8%, піва — на 6,3%». Вось вам і рэакцыя на крызіс. І гэта пры росце рэальных прыбыткаў у крызісным 2009 годзе ўсяго толькі на 2,9%!

Незадаволенасць, як любіў падкрэсліваць класік рускай сацыялогіі Юрый Левада, — «найбольш распаўсюджаны і найменш вызначаны від сацыяльных настрояў». Незадаволенасць «чалавека цярплівага» айчыннага ўзору накіравана як бы на ўсіх (ад уласнага становішча да галоўнага начальніка), але ў той жа час практычна не накіраваная нікуды. Такі тып незадаволенасці ў сацыялогіі прынята называць «дыфузным». Ён не ўяўляе пагрозы для ўлады, а, наадварот, служыць важным элементам захавання палітычнага status quo.

## Ад любові да нянавісці...

Чэрвеньскае апытанне НІСЭПД зафіксавала своеасаблівую ракіроўку на электаральнай дошцы: колькасць беларусаў, якія давяраюць «адзінаму палітыку» (АП), склала 33,6%, а тых, хто не давярае, — 53,8%. У снежні вынік быў адваротны: 55,0 і 34,1%. Колькасная змена — у наяўнасці, а як наконт якаснай? Альтэрнатывай дыфузнай незадаволенасці з'яўляецца палітычны ўдзел, гатоўнасць узяць на сябе адказнасць за становішча ў краіне. Які працэнт палітычных дэзерціраў (якія пакінулі ранейшую «большасць», быццам пацукі карабель, што тоне) гатовыя да такой адказнасці? Цікавае пытанне, пагадзіцеся.

Зноў звярнуся па дапамогу да класіка расійскай сацыялогіі: «Настроі ўсеагульнай і дыфузнай незадаволенасці — абавязковы прадукт усякай «эпохі перамен», калі традыцыйныя рамкі існавання падарваныя, а новыя арыентацыі смутныя, сродкі для іх рэалізацыі адсутнічаюць, ілюзіі руйнуюцца і г. д.». У чым на сённяшні дзень палягае невыразнасць новых арыентацый? Для мяне асабіста — у глыбіні трансфармацыі, на якую здольныя палітычныя дэзерціры.

Тут напрошваецца каментар. Няроўнасць, якая разумеецца як парушэнне прынцыпу справядлівасці, спараджае незадаволенасць. Гэта натуральна. Аднак услед за нямецкім палітолагам Ральфам Дарэндорфам неабходна адрозніваць няроўнасць забяспячэння і няроўнасць правоў. Тыповага прадстаўніка беларускай «большасці» праблема няроўнасці правоў не турбуе. Яна яму абыякавая. Ён цалкам згодны з АП у тым, што *«подлинная демократия — это гарантированный государством уровень жизни»*.

Сёння такіх гарантый дзяржава выдаць яму не ў стане. Адсюль рост дыфузнай незадаволенасці, у тым ліку і незадаволенасці самім АП. Але ці здольная гэта незадаволенасць перайсці з пэўнай асобы на аўтарытарную палітычную мадэль, канкрэтнай асобай створаную?

Апошняе апытанне НІСЭПД адназначнага адказу на гэта пытанне не дало. З аднаго боку, падзенне рэйтынгаў АП (электаральнага і даверу) суправаджалася ракіроўкай колькасці прыхільнікаў і апанентаў курсу развіцця краіны: колькасць першых са снежня па чэрвень скарацілася з 54,2 да 26,1%, колькасць другіх павялічылася з 32,2 да 61,8%. Але, з іншага боку, сіметрычнага росту рэйтынгу даверу апазіцыйных партый не здарылася: снежань — 16,3%, чэрвень — 20,1%.

Беларусы, хоць і не ўхваляюць курс развіцця краіны, тым не менш не спяшаюцца прылічваць сябе да апазіцыі. У чэрвені на пытанне: «Ці лічыце Вы сябе ў апазіцыі да цяперашняй улады?» станоўчы адказ далі 25,8% рэспандэнтаў, адмоўны — 60,3%. Не адзначаецца і прыкметнага росту пратэстных настрояў. Дэкларуюць сваю гатоўнасць прымаць удзел у мітынгах і пікетах сёння 16%. Гэта ўсяго толькі на 1 працэнтны пункт больш, чым у спрыяльным 2006 годзе адразу пасля заканчэння прэзідэнцкіх выбараў.

Ад любові да нянавісці, як вядома, ляжыць дыстанцыя ў адзін крок. Пераходы падобнага кшталту называюць інверсійнымі. Класічны прыклад такога пераходу беларусы мелі магчымасць назіраць на прыкладзе стаўлення рускіх да Барыса Ельцына. Інверсія не прадугледжвае паўтонаў. Той, хто яшчэ ўчора быў увасабленнем дабра, пачынае ўспрымацца як абсалютнае зло. Зразумела, што такая пераацэнка прыроды чалавека не змяняе, таму апошняя і канчатковая перамога над Злом апынаецца толькі чарговым звяном інверсійнага ланцуга.

РЭГІЁНЫ

# ЗА ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ ПА-СЛУЦКУ

Зінаіда ЦІМОШАК

**Індывідуальныя і калектыўныя звароты грамадзян па праблеме адстойвання сацыяльна-эканамічных правоў у Слуцку практыкуюцца даўно. Удзельнічаць у іншых актыўных формах пратэсту случчане пакуль што пабойваюцца, а подпісы ставяць даволі ахвотна.**

Два гады таму ў летні час горад быў пазбаўлены гарачай вады. Выканкам такім чынам эканоміў грошы. Супраць такога рашэння гарадской улады случчане сабралі больш за тысячу подпісаў, у выніку горад атрымаў гарачую ваду. Восенню мінулага года было сабрана больш за 3 тысячы подпісаў пад патрабаваннем да ўладаў устанавіць кантроль за становішчам сельскіх і гарадскіх могілак.

Пакуль цэны трымаліся, жыхары Слуцка больш за ўсё абураліся нізкай якасцю жыллёва-камунальных паслуг. З дапамогай актывістаў грамадзянскай кампаніі «Наш дом» і мясцовага таварыства абароны правоў спажыўцоў адбылося шмат судовых працэсаў па адстойванню якасці камунальных паслуг. Дарэчы, дабіцца судовага рашэння па рамонту пад'езда на карысць жыльцоў — гэта толькі пачатак змагання.

У гэтым зараз упэўнены жыхары Слуцка, якія пражываюць на вуліцы 8-га Сакавіка ў доме №22. У снежні 2010 года суд абавязаў КУП «Слуцкая ЖКГ» выканаць якасны рамонт пад'езда №3 да жніўня 2011 года. У чэрвені 2011-га рамонт быў зроблены, але настолькі дрэнна, што людзі палічылі яго здзекам і з суда, і з іх патрабаванняў. Так, напрыклад, няроўныя сцены ўнутры пад'езда пафарбаваны фасаднай фарбай бруднага зялёнага колеру, такія сцены нельга будзе памыць. Карнізы і паштовыя скрынкі маюць амаль што чорны колер, вокны зачынены назаўсёды пры дапамозе вялізных цвікоў.

Зараз жанчыны збіраюць подпісы пад калектыўным зваротам у ЖКГ і маюць намер адстойваць свае інтарэсы ў судзе. Калі яны выйграюць справу ў судовым працэсе, то камунальная гаспадарка будзе вымушана дадаткова патраціцца і на якасны рамонт, і на выплату маральнай кампенсацыі.

Цікавы накірунак у дзейнасці грамадскіх актывістаў — калектыўны збор подпісаў на імя дэпутатаў раённага савета з патрабаваннем справаздачы аб іх дзейнасці за год працы.

У канцы мая гэтага года было сабрана 323 подпісаў на імя дэпутата раённага савета Жылко А. Г., які займае пасаду дырэктара лягсаса. Выбаршчыкі з вуліцы Чэхава вельмі хацелі сустрэцца са сваім дэпутатам, каб пазнаёміцца з ім і задаць шмат набалелых пытанняў. Ды не давялося. Як толькі наверсе даведаліся пра памкненні грамадзян, сход з выбаршчыкамі быў праведзены настолькі імгненна і патаемна, што людзі дазналіся пра яго праз тыдзень пасля мерапрыемства.

Некалькі зацікаўленых жанчын усё ж такі наведалі дэпутата. Высветлілася, што народны выбраннік вядзе прыём у час працоўнага дня на сваім рабочым месцы. Зразумела, што чарга наведвальнікаў складалася з супрацоўнікаў лягсаса з рабочымі пытаннямі. Калі выбаршчыкі ўсё-такі трапілі ў кабінет дэпутата, той доўга не мог зразумець, якой справаздачы яны ад яго хочуць, і адаслаў з усімі пытаннямі да старшыні раённага савета дэпутатаў В. А. Ражанца. Той адказаў нават пісьмова: папера не пачырванела ад сораму, бо на ёй усё выглядала вельмі хораша.

Дзейнасць случчан — парасткі грамадзянскага грамадства.

РОЗДУМ

# ВІРТУАЛЬНЫ ДЫНАМІТ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**«Няма такога народа, які я б не пасадзіў у Бастылію», — быццам бы так адказаў кардынал Рышэлье на заўвагу графа Рашфора пра тое, што аўтарам абразлівых куплетаў з'яўляецца народ.**




Звычайна спецыяльныя службы рознымі спосабамі імкнуцца выявіць, пра што народ на самай справе думае і прамаўляе. Сёння ў Беларусі сацыялогія выкарыстоўваецца спецслужбамі ў якасці інструмента для правядзення «закрытых апытанняў».

Галоўная асаблівасць такой дэмаскапіі палягае ў тым, каб даць палітычнаму кіраўніцтву адэкватную карціну грамадскіх настрояў і меркаванняў, але атрымаць яе незаўважна ад самога грамадства. Вобразна кажучы, каб грамадства нават не здагадвалася, што яго думкі «пра начальства» на самай справе цікавяць начальства. Бо гэта можа выклікаць масавы сумнеў у самадастаковасці ўлады, што цягне за сабой пашырэнне пратэстных настрояў.

«Паліцэйская сацыялогія» дае наверх звесткі пра сапраўдныя настроі, а ўніз рэтранслюе тое, што садзейнічае захаванню і ўмацаванню палітычнай сітуацыі. Прыкладам, беларусам распавядаюць пра высокія рэйтынгі адных і поўную адсутнасць рэйтынгаў у другіх палітыкаў. Ці пра тое, што з года ў год Лукашэнка па папулярнасці пераўзыходзіць усіх.

У цывілізаваным грамадстве функцыю самаідэнтыфікацыі, асабістай інтэграцыі і дэзынтэграцыі выконваюць дэмакратычныя дзяржаўныя інстытуты, свабодная прэса (бо розныя выданні належаць розным выдаўцам і існуюць ва ўмовах канкурэнцыі і прававой дзяржавы, дзе магчымасці ўрадавых структур мець сваю прэсу зведзена да мінімуму) і разнастайныя структуры грамадзянскай супольнасці, якія маюць устойлівы і высокі ўзровень аўтаноміі ад дзяржаўных структур.

У нас, зразумела, усё наадварот. Ёсць такія грамадскія арганізацыі, дзе ўсе служаць урадавымі агентамі ці прыслугоўваюць ім. Малая надзея і на дзяржаўную прэсу, якая імкнецца маніпуляваць намі, падказваючы, пра што мы павінны думаць і што рабіць.

Прыкладам, БелТА ў загадкавым каментары «У рай трапляюць не праз сацыяльныя сеткі і маўклівае стаянне на плошчах» (!?) раіць «сацыяльным рэвалюцыянерам» у гэтую цяжкую для беларускіх фінансаў часіну не пратэставаць, а пайсці ў лес, назбіраць чарніц ды прадаць. Маўляў, і сабе карысць, і ўладам палёгка.

Як глыбокадумна адзначае БелТА, сёлета, пры параўнальным з мінулым годам ураджаі, кілаграм гэтай каштоўнай ягады каштуе ў два-тры разы болей. І быццам бы справа не ў недахопе долараў, а ў тым, што людзі сталі болей даражыць сваёй працай. Што, мусіць, някепска, дадае каментатар.

Зразумела, някепска. Але ж у людзей і ўлады розныя магчымасці. Адны могуць толькі хацець, а іншыя — рабіць што хочуць. Як толькі беларусам падалося, што яны пачалі патроху багацець, улада адразу іх апусціла на грэшную зямлю, абясцэніўшы іх працу якраз у два–тры разы. А долар на самай справе ні пры чым — яго ў Амерыцы друкуюць.

Да таго ж, на думку каментатара, акрамя часовых фінансавых цяжкасцяў, на краіну навалілася страшэнная бяда. Да традыцыйных наркотыкаў (алкаголь, марыхуана, «калёсы»), якія карыстаюцца шырокай ці больш вузкай папулярнасцю сярод беларусаў, далучыўся і *«всех затмил... интернет с его так называемыми социальными сетями»*. Маўляў, на віртуальную іголку падселі нядрэмныя маладзёны, што па начах, калі бацькі або бабулькі з дзядулькамі спяць, учыняюць вэрхал на розных інтэрнэт-форумах. Аўтар каментара называе іх «інтэрнэт-наркаманамі-крытыканамі», якія не разумеюць, што на самай справе выступаюць не супраць улады, а працуюць на разбурэнне дзяржавы.

Такім чынам, дэфініцыя зроблена намнога больш аб'ёмная, чым сумнавядомае калісьці сацыяльнае захворванне пад назвай млявай шызафрэніі, якой быццам бы хварэлі тыя, хто крытыкаваў савецкую ўладу. Такіх таксама саджалі ў турмы, а яшчэ ўладкоўвалі ў «псіхушкі», дзе медычнымі сродкамі прывівалі поўную палітычную лаяльнасць. На самай жа справе, шызафрэнікі-дысідэнты бэсцілі ўладу не за тое, што яна савецкая, а за тое, што не выконвае законаў, якія сама ж і прыняла. Дакладней, за тое, што ўлады жывуць «па панятках», а ўсіх астатніх змушаюць жыць па той частцы законаў, дзе не ўпамінаюцца правы, а выключна абавязкі «савецкага грамадзяніна».

Дысідэнтаў лекавалі ў псіхушках, бо хвароба была хоць і ўяўнай, але заразнай. Таму баяліся эпідэміі да таго самага часу, пакуль «шызафрэнікамі» не стала абсалютная большасць савецкіх людзей. А як выйшлі яны на плошчы, тут і надышоў канец і ўладзе, і дзяржаве.

Час ад часу кожнаму прыходзіцца змушана кантактаваць з людзьмі, пра якіх дрэнна думаеш, і яны пра тое ведаюць, але ўсё роўна лезуць да цябе з абдымкамі. Гэта вельмі непрыемна. Потым месца сабе не знаходзіш ад гідоты, што не хапае смеласці сказаць нахабніку праўду ў твар. Спытацца, як некалі хлопчык Сярожа з аднайменнага фільма: «Дзядзя Федзя, ты дурань?»

Інтэрнэт дае такую магчымасць самым баязлівым.

Вось таму ўлады так баяцца «сеціва». Яно — як лазня, усіх робіць роўнымі. Інтэрнэт, які імкліва набыў нечуваную папулярнасць (у дакладным значэнні — народнасць), ужо даўно замяніў сабой «закрытую сацыялогію». Каб уведаць, што пра яго думаюць, дастаткова кожнаму начальніку набраць сваё імя і пасаду ў любым пошукавіку. Але і гэта справа не для слабанервных. Наша ж улада аказалася менавіта такой — псіхічна неўраўнаважанай, але вельмі цікаўнай. І да пачутага і прачытанага выпала, як кажуць, у асадак. Аказваецца, яе не любяць, і гэтага нават не хаваюць.

Раней яшчэ можна было суцяшацца кампліментарнымі дадзенымі «спецапытанняў», зараз ад сярмяжнай праўды хоць на вуліцу не высоўвайся. Бо там — людзі, якія цябе не любяць, не жадаюць дабра ні табе, ні тваім блізкім, ні тваім сябрам-паплечнікам. У цябе адно веселле — у іх іншае.

У сферы матэрыяльнай былі адкрыцці, практычнае прымяненне якіх самым радыкальным чынам змяняла асновы сацыяльнага жыцця людзей. Са з'яўленнем агнястрэльнай зброі вайна перастала быць выключная справай рыцараў. Непісьменныя сяляне са стрэльбамі і гарматамі маглі б вынішчыць любое высакароднае ваярства, узброенае мячамі і пікамі. Са знікненнем рыцараў знік феадалізм. Потым да пораху дадаўся дынаміт, і аказалася, што амаль кожная, нават маленькая, дзяржава можа паспяхова ваяваць з дзяржавамі значна большымі і значна мацнейшымі. Увогуле, вайна перастала быць выключнай справай ваенных. У асабліва адказныя і рашучыя моманты іх нават пачалі пазбаўляць права прымаць адказныя рашэнні.

Дзякуючы такой мажлівасці сышлі на нішто міравыя імперыі, а палітычная мапа свету набыла сучасны выгляд.

Адэкватным палітычным афармленнем для яе стала дэмакратыя. Гэта значыць, рэальная палітыка была з адвечнага закулісся выцягнутая на вуліцу, на плошчу, дзе стала рэальнай справай звычайных людзей. Пра тых палітыкаў, хто гэтага катэгарычна не хацеў, гісторыя ці даўно забылася, ці захавала на сваіх старонках у якасці няўдалых тыранаў ці крымінальных злачынцаў.

Беларускія дзеячы любяць «хадзіць у народ», калі плошчы «зачышчаныя», а той народ спецыяльна падрыхтаваны і ў патрэбны час дастаўлены. Вось таму яны так люта ненавідзяць інтэрнэт, праз які персанальныя запрашэнні разлятаюцца імгненна.

Інтэрнэт — гэта не віртуальная іголка. Кнігадрук для духоўнай вытворчасці быў як порах для вытворчасці матэрыяльнай. А інтэрнэт — гэта віртуальны дынаміт. Дзякуючы яму палітыка становіцца насамрэч публічнай справай нават пры такіх «дэмакратах», якія, сеўшы аднаго разу на расійскую нафтагазавую іголку, не ведаюць, як з яе саскочыць.

▸ СУД

# ЖУРНАЛІСТ НА ЎМОЎНАЙ СВАБОДЗЕ

Вольга ХВОІН

**Журналіст Андрэй Пачобут асуджаны да трох гадоў пазбаўлення волі з адтэрміноўкай на два гады. З яго знялі абвінавачванне ў абразе прэзідэнта, але прызналі вінаватым у паклёпе ў дачыненні да прэзідэнта. Андрэя вызвалілі з-пад варты ў зале суда.**



Першыя хвіліны на свабодзе. Андрэй Пачобут з дачкой Янай і жонкай Аксанай

Андрэй Пачобут ад пачатку красавіка знаходзіўся пад вартай, ён быў гатовы да жорсткага прысуду. Да горшага варыянту рыхтаваліся і сям'я, і грамадскасць. Таму, калі Андрэй з'явіўся на ганку суда без канвіраў і аховы, людзі сустрэлі яго воклічамі радасці, жонка Аксана ледзьве стрымлівала слёзы радасці.

Андрэя Пачобута суддзя Ленінскага суда Гродна Віталь Лецка апраўдаў па частцы 1 артыкула 368 (абраза прэзідэнта Беларусі) і прызнаў вінаватым па частцы 1 артыкула 367 (паклёп у дачыненні да прэзідэнта) Крымінальнага кодэкса. Пракурор Аляксандр Южык прасіў суд пакараць журналіста пазбаўленнем волі на тры гады ў калоніі агульнага рэжыму.

Суд над карэспандэнтам вядомай польскай «Gazety Wyborczaj» быў закрытым ад самага пачатку. Не пускалі на судовае пасяджэнне і генеральнага консула Польшчы ў Гродна Анджэя Хадкевіча. Нават на вынясенні вердыкту дазволілі прысутнічаць толькі сямі асобам, але без журналістаў.

На працягу судовага працэсу міліцыя ўсяляк перашкаджала Андрэю нават праз плот ля будынка суда пабачыцца з сям'ёй. Жонцы Аксане заставалася толькі кожны раз, калі мужа тварам да зямлі вёў канвой, караскацца на плот і крычаць яму «Анджэй!» у спадзеве, што пачуе, зразумее, што не кінуты ў самоце.

Апошняе слова журналіста Андрэя Пачобута доўжылася менш за хвіліну. Ён толькі заявіў, што не прызнае ні сваёй віны, ні правамоцнасць гэтага суда.

***

Сям'я Андрэя — жонка Аксана, адзінаццацігадовая дачка Яна і гадавалы сын Яраслаў. У чаканні прысуду некалькі гадзін журналістка НЧ правяла разам з дачкой Пачобута Янай. Дзяўчынка ўжо добра разумее, за што судзяць тату: «Бо Лукашэнка не хоча праўды, якая падрывае давер да яго». Расказвае пра апошнія палітычныя навіны Беларусі і свету, пра сваю сям'ю, пра тату. «Ён любіць плаваць, любіць гэтую фізічную нагрузку, і калі яе няма, то кажа, што нядобра пачуваецца», — распавядае Яна. Менавіта тата запісаў яе ў гурток па плаванню, і цяпер яна ўжо добра ўмее трымацца на вадзе.

Дачка таксама хоча стаць журналістам, застацца жыць у Гродна і працягваць справу бацькі. Дзяўчынка некалькі разоў узгадвае пра арышты Андрэя, але не як пра нешта надзвычайнае, а хутчэй як пра асаблівасці прафесіі. І хаця Андрэй Пачобут папярэджваў дачку, што прафесія журналіста няпростая, ды і Яна бачыць, што тата ўвесь час у раз'ездах, у працы — «у яго адзін выходны, і той ён часта праводзіць за кампутарам, рыхтуючы матэрыялы», — дзяўчынка ў сваім выбары пакуль не сумняваецца. Але пісаць на «жаночыя» тэмы пра сукенкі-касметыку не хацела б, бо гэта «не цікава». З бацькамі Яна нямала падарожнічала. «Мінск вялікі і сумны, — дзеліцца сваімі ўражаннямі дзяўчынка. — Мне падабаецца Горадня, маленькія гарады».

Настаўнікі ў школе ведалі пра арышт Янінага таты, але нейкіх зменаў у адносінах да сябе яна не заўважыла. Распавядае пра ананімныя лісты і званкі невядомых «добразычліўцаў» з пагрозамі і са здзеклівымі словамі. Аднак мама і родныя да гэтага ставяцца з гумарам: «Мы пасмяяліся і ўсё», — рэзюмуе Яна.

***

Сваё вызваленне Андрэй Пачобут называе вынікам вялікай міжнароднай салідарнасці. «Вынесены прысуд — гэта вынік ціску на рэжым Лукашэнкі, вынік увядзення эканамічных санкцый у дачыненні да рэжыму, менавіта гэтага і баіцца Лукашэнка», — заявіў Андрэй на ганку судовага будынку. Хваля салідарнасці напраўду была вялікай. Вызвалення Андрэя Пачобута патрабавалі беларускія і міжнародныя праваабарончыя структуры, кіраўніцтва Еўрасаюза, ЗША і Польшчы. У Польшчы ладзілася адмысловая інфармацыйная кампанія ў падтрымку журналіста.

Цягам бліжэйшага тыдня Андрэй Пачобут будзе бавіць час з сям'ёй. Першае, што ён зрабіў пасля свайго вызвалення, — узяў на рукі гадавалага сына. «Сын вельмі вырас за гэты час, быў зусім маленькі, калі мяне забіралі… А потым буду, як і раней, працаваць карэспандэнтам «Gazety Wyborczaj», буду сябрам Саюза палякаў. На маю дзейнасць і погляды турма ніяк не паўплывала. Хіба што я стаў яшчэ больш жорсткі ў некаторых ацэнках».

Пачобут мае намер абскардзіць вынесены яму прысуд. «Пакуль ёсць хоць нейкія магчымасці для гэтага, буду абскарджваць. Гэты працэс быў не судом, а судзілішчам», — заявіў журналіст. Варта нагадаць, што ўмоўны тэрмін мае свае абмежаванні. Пасля ўступлення прысуду ў законную сілу Андрэю можа быць забаронены выезд за мяжу, у выпадку адміністрацыйных парушэнняў — дастаткова дарогу перайсці ў непатрэбным месцы — могуць быць прыменены карныя санкцыі. Праз два гады зноў мусіць адбыцца суд, які будзе вырашаць, ці стаў непакорны журналіст на шлях выпраўлення.

Андрэй Пачобут супакоіў сваіх калег, што катаванні, фізічны гвалт да яго не прымяняліся. Але зазначыў: «Турма ёсць турмой, і там свае асаблівасці. Нават у няволі трэба змагацца за свае правы». У дзень абвяшчэння прысуду адвакаты Андрэя заўважылі на шыі пачырваненні. «Калі мяне вёў судовы канвой у залу суда, — патлумачыў Андрэй, — адзін з канвіраў так моцна закруціў мне рукі за спіною, што я проста не ўтрымаўся і ўпаў тварам на падлогу. Гэта адбылося, калі мяне выводзілі з аўтазака».

З прымяненнем фізічнай сілы перастараліся не толькі ў дачыненні да Андрэя. Каля будынку суда невядомыя ўсюдыісныя людзі ў цывільным перашкаджалі працы фотажурналістаў самым брутальным спосабам. Ад іх удараў у фатографа «Associated Press» Сяргея Грыца на перадплечысы засталіся вялікія крывападцёкі.

Крымінальная справа ў дачыненні да Андрэя Пачобута была заведзеная 28 сакавіка. У пастанове пракуратуры сказана: «Пачобут А. С. <...> у перыяд 2010–2011 года размясціў у глабальнай кампутарнай сетцы інтэрнэт на сайтах *www.wyborcza.pl*, *belaruspartisan.org* і *poczobut.livejournal.com* створаныя ім тэкставыя публікацыі, пад назвай «Час закручваць гайкі», «Лукашэнка знайшоў чарговую мэта», «У Беларусі выбары без выбару», «Гаварыце мне бацька», «Так кіруе Лукашэнка», «Лукашэнка: Так, я сфальсіфікаваў выбары», «Свабода па-беларуску. Пакаўся, то выйшаў?», «Перадвыбарчы папулізм па-беларуску», «Так палохае беларускі КДБ», і адзін тэкст без загалоўка, які пачынаецца словамі «Дзякуй усім...» і заканчваецца словамі «...можаце выкарыстоўваць», у якіх утрымліваюцца прыкметы публічнай абразы прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», — нагадвае інфармацыйнае агенцтва БелаПАН.

Пачобут быў затрыманы 6 красавіка за парушэнне падпіскі аб нявыездзе: ён збіраўся выехаць з Гродна ў Мінск для ўдзелу ў відэаканферэнцыі з дэпутатамі Еўрапарламента. Спачатку Пачобута затрымалі на трое сутак, затым меру стрымання змянілі з падпіскі аб нявыездзе на ўтрыманне пад вартай.

▸ ЗАТРЫМАННІ

# ДЭПАРТАВАНАЯ ПАЭЗІЯ

Алесь ГІНЗБУРГ

**4 ліпеня з тэрыторыі Беларусі быў дэпартаваны малады балгарскі паэт, лаўрэат прэміі «Дэбют» 2002 года Дзімітар Кенараў. Да гэтага ён правёў без малага 5 сутак у ізалятары часовага ўтрымання ў Мазыры.**

Прычынай арышту стала тое, што пры хлопцы не было дакументаў (ён згубіў пашпарт падчас паездкі па Беларусі). Прычынай дэпартацыі — спроба займацца журналістыкай без акрэдытацыі МЗС РБ.

Як паведаміў Кенараў у інтэрв'ю парталу tut.by, ён прыехаў у Беларусь, каб зрабіць рэпартаж для амерыканскага часопіса «Virginia Quarter Review», які запланаваў на восень гэтага года спецвыпуск, прысвечаны краінам былога СССР. Дзімітар і яго сябар журналіст Джэйсан Мотла выбралі для камандзіроўкі Беларусь: «Я размаўляю па-руску, а Джэйсан добра фатаграфуе». 29 чэрвеня яны апынуліся ў Мазыры, паколькі адной з тэмаў, якая іх цікавіла, быў Чарнобыль і яго наступствы.

Дзімітар планаваў зрабіць рэпартаж, прысвечаны беларускаму машынабудаўніцтву. Аднак на мінскі МТЗ яго не пусцілі, хоць у візіце — слаўная чынавенская звычка — наўпрост не адмовілі. І тады Дзімітар патэлефанаваў на «Мазырмаш». Журналістаў запрасілі прыехаць, але пасля кароткай экскурсіі па цэху здалі ў міліцыю.

Амерыканскі журналіст быў выпушчаны праз некалькі гадзінаў, дзякуючы ўмяшанню консула ЗША. Балгарына пакінулі пад арыштам «для высвятлення асобы», дзе ён і правёў увесь час да дэпартацыі.

Балгарыя — якую нездарма калісь называлі 16-й рэспублікай СССР — адна з новых краін-сябровак Еўрасаюзу. Нягледзячы на гэта, грамадзянская супольнасць Балгарыі востра незадаволеная сваім урадам які, паводле іх апісанняў, успадчынніў шмат якія негатыўныя рысы ад сваіх папярэднікаў-камуністаў. Пра ўсё гэта можна было прачытаць у суполцы Фэйсбука, створанай у падтрымку Дзімітара Кенарава. Адной з актывістак суполкі была маці паэта — Благавеста Кенарава. Дарэчы, бацька Дзімітара — Пламен Кенараў — доктар медыцыны, палітык з ліберальнага ўраду балгарская прэм'ера 2001–2005 гадоў, былога (і апошняга) караля Балгарыі Сіміяона II.

Толькі дзякуючы розгаласу, які стварылі бацькі і сябры Кенарава ў Балгарыі, балгарскі МЗС паскорыў працэдуру выдачы вязню мазырскага ІЧУ часовага пашпарту — зазвычай гэтая працэдура займае да двух тыдняў. Ужо ў суботу 2 ліпеня хлопец меў на руках дакументы. Але пад арыштам яго трымалі аж да 4-га.

Кенараву таксама забаранілі ўезд на тэрыторыю РБ на тры гады — «у мэтах грамадскай бяспекі». Зараз былы вязень знаходзіцца ў Сафіі ў коле сям'і. «Нягледзячы на непрыемнасці, я мушу зазначыць, што я ні разу не быў падвергнуты жорсткаму абыходжанню з боку беларускіх уладаў. Наадварот — большасць міліцыянтаў ставіліся да мяне з павагай і нават сімпатыяй. Я маю толькі найлепшыя ўражанні ад звычайных беларусаў, гэта чуллівыя і вельмі добрыя людзі. Усе праблемы Беларусі — на вышэйшым палітычным узроўні», — напісаў Дзімітар Кенараў 6 ліпеня, падзякаваўшы актывістам Фэйсбуку (і асабіста Марку Цукербергу) за падтрымку. Ён прызнаваў, што без розгаласу ў сацыяльных сетках яго б ні вызвалілі так хутка.

Дзімітар Кенараў вядомы ў Балгарыі найперш як паэт. Ён — аўтар двух зборнікаў вершаў «Вандроўка на кухню» (2001) і «Апокрыфныя жывёлы» (2010). Ён вывучае амерыканскую і рускую літаратуры ў дактарантуры ўніверсітэта Берклі (Каліфорнія) і піша нарысы для розных амерыканскіх выданняў.

Цікава, што Кенараў — не адзіны замежны паэт, якому забаронена прыязджаць у Беларусь. У сакавіку 2006-га з тэрыторыі РБ тэрмінам на 10 гадоў быў дэпартаваны студэнт філфаку Ужгарадскага нацыянальнага ўніверсітэта Андрый Любка. Ён працаваў у Мінску замежным назіральнікам, а таксама дарадцам штабу Аляксандра Мілінкевіча. Па яго нових словах, яго арыштавалі і пасадзілі на 15 сутак («у адну камеру з Анатолем Лябедзькам!») яшчэ да выбараў 19 сакавіка.

Ужо пасля гэтых невясёлых падзеяў ён стаў вядомы ва Украіне як цікавы малады паэт, аўтар паэтычных зборнікаў «Восем месяцаў шызафрэніі» (2007) і «Тэрарызм» (2008), аўтар эсэ і мастацкай прозы.

Адна з будучых старонак свабоднай Беларусі — гэта супольны творчы вечар Дзімітра Кенарава і Андрыя Любкі на адной з творчых пляцовак краіны.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 13 ЛІПЕНЯ, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00 (з сурдаперакладам), 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтарэсаў». Эканамічная праграма.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2011». Дзённік.
**10.15** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.05** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**12.15** Меладрама «Кветкі правінцыі».
**13.45** «Ф.М.Дастаеўскі. «Бясстрашны праведнік Імя Хрыстова». Дак. фільм.
**14.15** Сінематэка.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Камедыйны серыял «Прыгоды салдата Івана Чонкіна» (Расія).
**16.35** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.30** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.25** Зямельнае пытанне.
**18.45, 00.40** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2011». Вячаслаў Дабрынін.
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.50** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2011». Дзённік.
**22.00** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2011». «Сябры» збіраюць сяброў».
**23.50** «Доктар Хаўс-5». Серыял (ЗША).
**00.45** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе:»Наша раніца».
**09.05** «Жыць выдатна!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**11.55** «Дэтэктывы».
**12.30** «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Жадаю ведаць» з Міхасём Шырвіндтам.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальнае кольца». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Зачараваны ўчастак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Хірамант. Лініі лёсаў».
**22.10** «Атлантыда». Расія, 2007.
**23.05** «Сведкі».
**00.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**00.45** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Кіно»:»07 змяняе курс». Расія.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Халасцякі». Серыял.
**14.40** «Забойчая сіла 3». Серыял.
**15.40** «Next 3». Серыял.
**16.50** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск». Радыё Online.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Кіно»: «Муж на гадзіну». Расія.
**22.10** «Калі ласка, скардзіцеся».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойчая сіла 3». Серыял.
**23.55** «Водбліскі». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**10.10** Альбарутэнія.
**10.35** «Лабірынты: мураваныя замкі старажытнай Літвы». Частка 1-я.
**11.05** Жансавет.
**11.35** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення». Восьмыя класы. Трэці паўфінал.
**12.40** Фільм-казка «Прыгоды Бураціна» («Беларусьфільм»). 1-я серыя.
**13.45** Мультсерыял «Маша і Мядзведзь».
**14.00** Спорт-кадр.
**14.30** Рэальны свет.
**14.55** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**15.15** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**16.15** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Спортлата 5 з 36».
**21.25** КЕНО.
**21.30** Меладрама «Хелен».
**23.35** Бітва экстрасэнсаў.
**00.25** Рэальны свет.

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Далікатны патрашыцель. Урмас Отт». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00** Весці.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Колер полымя».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**18.00** Тэлесерыял «Пяць мінуць да метро».
**18.55** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весці.
**20.30** Тэлесерыял «Колер полымя».
**22.15** «Смерць шпіёнам!».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весці.ru».
**23.55** Фэст «Славянскі кірмаш - 2011».

**07.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05** Сёння.
**10.20** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў з Веніямінам Смехавым.
**11.10** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** Дэтэктыўны серыял «Мужы».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Асоба небяспечны!».
**18.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Масква. Тры вакзала».
**21.20** Серыял «Гадзіна Волкава».
**23.30** «Алтар Перамогі. Генералісімус».
**00.20** «Адзін дзень. Новая версія».

**09.30, 13.45** Ралі рэйд. «Шаўковы шлях». Дзень 3-і.
**09.45** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно (Будапешт, Вугоршчына). Агляд.
**10.15** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс».
**11.15, 12.30** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Германія. 1/4 фіналу.
**14.00, 14.55, 00.00** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс».
**18.45, 23.45, 02.15** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**19.00, 21.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Германія. 1/2 фіналу.
**20.55** Навіны.
**21.00** Футбол. Кубак свету да 17 гадоў. Мексіка. Фінал.
**01.00** Навіны.
**01.05** Ралі рэйд. «Шаўковы шлях». Дзень 4-ы.
**01.20** «Шлях на XXVI Універсіяду» (Шэньчжэнь, Кітай). Навіны.
**01.35** Вось дык так!!!

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25, 12.55** «Ранча Пікова Сямёрка», серыял: 21 серыя.
**07.50** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 45 серыя.
**08.45** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**09.00** Праект «Будучыня».
**09.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, рэж. Робэрт Качмарэк, 2006 г., Польшча: ч. 2.
**10.25** «Ранча», серыял: 20 серыя.
**11.20** «Бульбаны», мультсерыял.
**11.25** Невядомая Беларусь: «НКУС – Гестапа. Браты па крыві», дак. фільм, рэж. Уладзімір Самойлаў, 2009 г.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Прыватная калекцыя.
**12.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**13.25** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 45 серыя.
**14.20** Праект «Будучыня».
**14.45** Паляванне на дзівосы.
**15.05** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, рэж. Робэрт Качмарэк (Robert Kaczmarek), 2006 г., Польшча: ч. 2.
**16.00** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 19 серыя.
**16.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Пікова Сямёрка», серыял: 22 серыя.
**17.30** «Дэтэрмінатар», серыял: 2 серыя.
**18.15** «Легенда Грунвальду», дак. фільм, рэж. Міраслаў Граноўскі, 2010 г., Польшча.
**19.10** YoLife.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Паляванне на дзівосы.
**20.00** На колах.
**20.30** Басанож па свеце.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Побач з намі.
**21.45** Вагон.
**21.50** «Quo Vadis?», тэлесерыял: 3 серыя.
**22.40** «Euromaxx».
**23.05** Аб'ектыў.

## 14 ЛІПЕНЯ, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00** (з сурдаперакладам), 15.00, 19.00, 00.10 Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Дак. цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна). Фільм «Эмігранты. Расколатыя сэрцы».
**10.05** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2011». Дзённік.
**10.15** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.05** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**12.15** Меладрама «Вечны муж». 1-я серыя.
**13.45** Патрабуецца.
**14.00** Шэф-повар.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Камедыйны серыял «Прыгоды салдата Івана Чонкіна» (Расія).
**16.35** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.30** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.25** Сфера інтарэсаў.
**18.45, 01.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2011». Майстры мастацтваў Украіны.
**21.00** Панарама.
**21.35** Актуальнае інтэрв'ю.
**21.50** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2011». Дзённік.
**22.00** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2011». Майстры мастацтваў Расіі.
**00.25** «Доктар Хаўс-5». Серыял (ЗША).
**01.15** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе:»Наша раніца».
**09.05** «Жыць выдатна!».
**10.20** «Смак».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**11.55** «Дэтэктывы».
**12.30** «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Жадаю ведаць» з Міхасём Шырвіндтам.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальнае кольца». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Зачараваны ўчастак». Шматсерыйны фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Хірамант. Лініі лёсаў».
**22.10** «Атлантыда». Расія, 2007.
**23.05** Тэорыя неверагоднасці. «Бацькоўскі інстынкт».
**23.50** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**00.35** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Калі ласка, скардзіцеся».
**08.50** «Кіно»: «Муж на гадзіну». Расія.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Халасцякі». Серыял.
**14.40** «Забойчая сіла 3». Серыял.
**15.40** «Next 3». Серыял.
**16.50** «Мінск і мінчукі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Кіно»: «Акулы ў Малібу». Аўстралія.
**22.10** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойчая сіла 3». Серыял.
**23.55** «Водбліскі». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**10.00** Альбарутэнія.
**10.30** «Лабірынты: мураваныя замкі старажытнай Літвы». Частка 2-я.
**10.55** Жансавет.
**11.30** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення». Восьмыя класы. 4-ы паўфінал.
**12.30** Фільм-казка «Прыгоды Бураціна» («Беларусьфільм»). 2-я серыя.
**13.45** Мультсерыял «Маша і Мядзведзь».
**13.55** «Дарога да хаты». Дак. фільм.
**14.25** «Рэальны свет».
**14.55** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**15.15** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**16.15** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**17.50** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**19.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Шахцёр» (Беларусь) - «Вентспілс» (Латвія). Прамая трансляцыя.
**22.05** КЕНО.
**22.10** Тэлебарометр.
**22.15** Баявік «Гонар цмока» (Тайланд).
**23.50** «Час футбола».
**00.15** Бітва экстрасэнсаў.

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Той, хто перажыў тырана». Дакументальны фільм.
**11.00** Весці.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Колер полымя».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весці.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весці.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст.
**18.00** Тэлесерыял «Пяць мінуць да метро».
**18.55** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весці.
**20.30** Тэлесерыял «Колер полымя».
**22.15** «Смерць шпіёнам!».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весці.ru».
**23.55** Фэст «Славянскі кірмаш - 2011».

**07.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «Банкет на ўвесь свет».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Дэтэктыўны серыял «Мужы».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Асоба небяспечны!».
**18.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Масква. Тры вакзала».
**21.20** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Гадзіна Волкава».
**23.05** Сёння.
**23.30** «Вочная стаўка».
**00.20** «Адзін дзень. Новая версія».

**09.30** Ралі рэйд. «Шаўковы шлях». Дзень 4-ы.
**09.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Германія. 1/2 фіналу.
**11.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**11.15, 12.10, 23.55** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс».
**18.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы да 23 гадоў.
**20.55, 01.30** Навіны.
**21.00** Снукер. Кубак свету (Тайланд).
**01.35** Ралі рэйд. «Шаўковы шлях». Дзень 5-ы.
**01.50** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы да 23 гадоў (Астрава, Чэхія). Дзень 1-ы.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** «Ранча Пікова Сямёрка», серыял: 22 серыя.
**07.50** «Дэтэрмінатар», серыял: 2 серыя.
**08.40** Паляванне на дзівосы.
**08.55** Побач з намі.
**09.15** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.40** «Легенда Грунвальду», дак. фільм, рэж. Міраслаў Граноўскі, 2010 г., Польшча.
**10.40** «Ранча» (Ranczo), серыял: 21 серыя.
**11.30** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 19 серыя.
**12.50** «Ранча Пікова Сямёрка», серыял: 22 серыя.
**13.15** «Дэтэрмінатар» серыял: 2 серыя.
**14.00** Побач з намі.
**14.15** На колах.
**14.45** Басанож па свеце.
**15.10** YoLife.
**15.25** «Легенда Грунвальду», дак. фільм, рэж. Міраслаў Граноўскі, 2010 г., Польшча.
**16.30** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Чароўнае дрэва», серыял: 6 серыя.
**17.35** «Quo Vadis?», тэлесерыял: 3 серыя.
**18.20** «Падзенне жалезнай заслоны», дак. фільм, 2009 г.
**19.15** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Навігатар.
**19.55** «Euromaxx».
**20.25** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.40** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «89 міліметраў ад Еўропы», рэпартаж, рэж. Марцэль Лазіньскі, 1993 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Беларусы ў Польшчы.
**21.45** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 14 серыя.
**22.35** Рэпартэр.
**23.00** МакраФон: «Minsk-Mixt–2008»: Канцэрт гурта «Svet Boogie Band».
**23.15** Аб'ектыў.

# 9 ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 15 ЛІПЕНЯ, ПЯТНІЦА

**БТ-1**

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00** (з сурдаперакладам), 15.00, 19.00, 00.10 Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.10** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна). Фільм «Дзеці-акцёры-2».
**10.05** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2011». Дзённік.
**10.15** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.05** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**12.15** Меладрама «Вечны муж» («Беларусьфільм»). 2-я серыя.
**13.40** «Пётр Конюх». Дакументальны фільм.
**14.05** Сінематэка.
**14.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Камедыйны серыял «Прыгоды салдата Івана Чонкіна» (Расія). Закл. серыя.
**16.35** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Маё дзіця ненавідзіць музыку».
**17.35** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.30** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2011». Мікалай Баскоў.
**21.00** Панарама.
**21.50** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2011». Дзённік.
**22.00** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2011». Урачыстае зачыненне.
**00.25** Камедыя «Дзяўчына майго лепшага сябра» (ЗША).
**02.00** Дзень спорту.

**АНТ**

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе:»Наша раніца».
**09.05** «Жыць выдатна!».
**10.20** «Смак».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**11.55** «Дэтэктывы».
**12.30** «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Жадаю ведаць» з Міхасём Шырвіндтам.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальнае кольца». Шматсерыйны фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** 10 гадоў у эфіры! Шоў Андрэя Малахава.
**23.05** Прэм'ера. Канцэрт Рыгора Лепса.
**00.35** Джон Траволта, Сальма Хайек у фільме «Самотныя сэрцы».
**02.20** Начныя навіны.

**СТВ**

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Кіно»: «Акулы ў Малибу». Аўстралія.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Халасцякі». Серыял.
**14.40** «Забойная сіла 3». Серыял.
**15.40** «Next 3». Серыял.
**16.50** «У параднага пад'езда» з Кацярынай Забенько.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Камедыя па пятніцах»: «Рэстаран спадара Сэптыма». Францыя, 1966г.
**22.00** «З чаго пачынаецца Радзіма».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** Канцэрт «Лета ў стылі Нон-Стоп! Група «Без Білета».
**23.30** «Кіно»: «Зман». ЗША, 2006г.

**ЛАД**

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Меладрама «Леташняя кадрыля».
**10.25** «Закаханы дуэт». Дак. фільм.
**11.00** «Кожны мае права быць розным». Сонечныя дзеці.
**11.25** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення». Восьмыя класы. Фінал.
**12.30** «Лясныя арэлі» («Беларусьфільм»).
**13.35** Мультсерыял «Маша і Мядзведзь».
**13.50** Час футбола.
**14.20** Рэальны свет.
**14.50** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**15.10** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**16.15** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Бітва экстрасэнсаў.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Фільм-фэнтэзі «Брама» (ЗША).
**20.35** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.10** Баявік «Даміно» (ЗША - Францыя).
**00.20** Бітва экстрасэнсаў.
**01.10** «Пра мастацтва».
**01.35** Дыялогі пра рыбалку.

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Мой срэбны шар. Аляксей Кавуноў».
**11.00** Весці.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Колер полымя».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весці.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весці.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**18.00** Тэлесерыял «Пяць мінуць да метро».
**18.55** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весці.
**20.30** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.15** Урачыстая цырымонія зачынення Міжнароднага фэсту «Славянскі кірмаш у Віцебску».
**23.40** Навіны - Беларусь.
**23.50** «Аповесць непагашанага месяца».

**НТВ**

**07.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «І зноў добры дзень!».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** Дэтэктыўны серыял «Мужы».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.15** «Асоба небяспечны!».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Масква. Тры вакзала».
**21.20** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Гадзіна Волкава».
**23.05** «Песня для вашага століка».
**00.15** Крымінальны трылер «Не які пакідае следу».

**EUROSPORT**

**09.30, 13.45** Ралі рэйд. «Шаўковы шлях». Дзень 5-ы.
**09.45, 14.00, 14.55, 00.25** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс».
**11.00, 18.45, 01.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы да 23 гадоў.
**20.55** Навіны.
**21.00** Снукер. Кубак свету (Бангкок, Тайланд).
**22.00** Бокс. Міжнародны паядынак. Суперсярэдняя вагавая катэгорыя. Сэм Саліман (Аўстралія) - Бенджамін Сайман (Германія). Германія.
**00.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Акорес, Партугалія). Дзень 1-ы.
**01.25** Навіны.
**01.30** Ралі рэйд. «Шаўковы шлях». Дзень 6-ы.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** «Чароўнае дрэва», серыял: 6 серыя.
**07.55** «Гняздо», серыял: 7 серыя.
**08.45** Навігатар.
**09.05** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «89 міліметраў ад Еўропы», рэпартаж, рэж. Марцэль Лазінські, 1993 г., Польшча.
**09.55** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 14 серыя.
**10.45** «Падзенне жалезнай заслоны», дак. фільм, 2009 г.
**11.40** Беларусы ў Польшчы.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Quo Vadis?», тэлесерыял: 3 серыя.
**12.50** «Чароўнае дрэва», серыял: 6 серыя.
**13.20** «Гняздо», серыял: 7 серыя.
**14.10** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.40** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «89 міліметраў ад Еўропы», рэпартаж, рэж. Марцэль Лазінські, 1993 г., Польшча.
**14.55** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**15.10** Беларусы ў Польшчы.
**15.25** «Падзенне жалезнай заслоны», дак. фільм, 2009 г.
**16.15** Рэпартэр.
**16.40** YoLife.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял: 6 серыя.
**17.35** «Грунвальд: 1410–2010. Інсцэнізацыя бітвы».
**18.35** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 14 серыя.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.05** Праект «Будучыня».
**20.30** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.40** Аўтастопам праз Еўропу.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г.
**22.25** «Пітбуль» (Pitbull), серыял: 19 серыя.
**23.10** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.20** Аб'ектыў.

## 16 ЛІПЕНЯ, СУБОТА

**БТ-1**

**07.00** Існасць.
**07.25** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.40** «Шэф-повар».
**10.40** «Ведай нашых».
**10.55** Серыял па выходных. Меладрама «Спроба Веры» (Расія).
**12.10** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Музычная камедыя «Цырк» (СССР).
**13.50** «Уяўны Парыж». Дак. фільм.
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.20** Nota Bene.
**16.45** Дак. цыкл «Атлас «Дыскаверы» (ЗША). Фільм «Францыя». Частка 1-я.
**17.40** Відэафільм АТН «Прывіды Лідскага замка» цыкла «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.15** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2011». Любоў Успенская.
**21.00** Панарама.
**21.40** «Славянскі кірмаш у Віцебску-2011». «З юбілеем, фэст!».
**23.20** Баявік «Шырока крочачы» (ЗША).

**АНТ**

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** «Мой сын - Андрэй Краско».
**12.15** Суботні «Ералаш».
**12.35** Фільм «Афоня».
**14.10** «Хвіліна славы».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. «Па слядах вялікіх рускіх вандроўцаў. Міклуха-Маклай».
**17.20** Ігар Скляр, Аляксандр Панкратаў-Чорны, Алена Цыплакова ў камедыі «Мы з джаза».
**18.50** Фільм «Міс Петыгру жыве сённяшнім днём».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ў краіне жанчын».
**22.50** «Адрачэнцы».

**СТВ**

**07.00** Мультыплікацыйныя фільмы.
**07.40** «Сапраўдная гісторыя».
**08.10** «Кіно»: «Рэстаран спадара Сэптыма». Францыя, 1966г.
**09.45** Прэм'ера! «Чыстая праца».
**10.30** «Мінск і мінчукі».
**11.00** Прэм'ера! «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**11.30** «Салдаты. Дэмбель непазбежны!». Серыял.
**13.25** «Новыя вандраванні дылетанта».
**14.00** «Залатая калекцыя»: «Салодкая жанчына». СССР, 1976 г.
**15.45** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** «Кіно»: «На Мурамскай Дарожцы». 1993г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Сусветны блокбастар»: «Дом Вялікай Матулі. ЗША - Германія, 2000 г.
**21.55** «Нефармат»: «Зямля тыгра». 2000 г.
**23.35** «Зорны рынг».

**ЛАД**

**06.20** Прыгоды Агента 007. Баявік «Шаравая маланка» (Вялікабрытанія).
**08.30** Жансавет.
**08.55** Дача здароўя.
**09.25** Фільм-фэнтэзі «Брама» (ЗША).
**11.00** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**11.25** Тэлебарометр.
**11.30** Нашы тэсты.
**12.05** Дыялогі пра рыбалку.
**12.35** Камедыйны серыял «Страхоцце Бэцці 3» (ЗША).
**13.25** «Жарсці па культуры».
**14.05** «Магія раяля». Музычны форум.
**15.10** Серыял «Маргоша» (Расія).
**18.40** Тэлебарометр.
**18.45** Прыгоды Агента 007. Баявік «Шаравая маланка» (Вялікабрытанія).
**21.00** КЕНО.
**21.05** Фантастычны шпіёнскі трылер «Кодар» (ЗША).
**22.45** Канцэрт Celine Dion. Taking Chances World Tour (ЗША).

**РОССИЯ**

**07.00** «Доўгі дзень».
**08.30** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**10.25** «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
**11.00** Весці.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** «Аповесць непагашанага месяца».
**13.25** Мультфільмы.
**14.00** Весці.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма Эдуарда Пятрова.
**14.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.15** «Улада факту».
**16.00** «Справа была ў Пяньковe».
**17.40** «Суботні вечар».
**19.25** «Смяяцца дазваляецца». Дайджэст. Гумарыстычная праграма.
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весці ў суботу.
**20.40** «Хронікі здрады». 2010 г.
**22.40** «Пажар». 2010 г.

**НТВ**

**07.40** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь. Мультфільмы.
**08.00** Сёння.
**08.20** «У зоне адмысловай рызыкі».
**08.50** «Медыцынскія таямніцы».
**09.25** «Увага: вышук!» з Ірынай Воўк.
**10.00** Сёння.
**10.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.50** «Кулінарны паядынак» з Дзянісам Ражковым.
**11.40** «Кватэрнае пытанне».
**12.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Справа цёмнае». Гістарычны дэтэктыў з Веніямінам Смехавым. «Сава Марозаў. Загадкавая смерць «паркалёвага караля».
**14.10** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**15.40** «Развод па-руску».
**16.30** «Следства вялі…».
**17.15** «Вочная стаўка».
**18.10** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «УГРО».
**19.00** Сёння.
**19.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «УГРО».
**20.15** «Самыя гучныя Рускія сенсацыі: Квадратныя метры ўлады. Мэрыя несмяротная. Квадратныя мэтры».
**22.35** «Ты не паверыш!».
**23.10** «Выспа праклятых».
**01.30** «Пара Пінаэчтаў».

**EUROSPORT**

**09.30** Ралі рэйд. «Шаўковы шлях». Дзень 6-ы.
**09.45** Плаванне. Чэмпіянат свету. Скачкі ў ваду з трампліна. 1 м. Мужчыны. Папярэднія спаборніцтвы (Шанхай, Кітай).
**11.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы да 23 гадоў.
**12.30** Плаванне. Чэмпіянат свету. Сінхронныя скачкі ў ваду з трампліна. 3 м. Жанчыны. Фінал (Шанхай, Кітай).
**13.10** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс». Сен-Гадан - Плато дэ Бель. Францыя. 14-ы этап.
**18.30** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Матч за 3-е месца (Германія).
**20.30** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**20.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы да 23 гадоў.
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.(Румынія).
**00.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Акорес, Партугалія). Дзень 2-і.
**00.25** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс».
**01.30** Ралі рэйд. «Шаўковы шлях». Дзень 7-ы.
**01.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Навіны.
**02.00** Вось дык так!!!

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25, 11.55** «Машына зменаў», тэлесерыял: 6 серыя.
**07.55** Калыханка для самых маленькіх.
**08.35, 13.20** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 14 серыя.
**09.25** Праект «Будучыня».
**09.55** «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г.
**10.50** МакраФон: «Minsk-Mixt–2008»: Канцэрт гурта «Svet Boogie Band».
**11.15** Аўтастопам праз Еўропу.
**11.35** Хто ёсць кім?: «Уладзімір Арлоў».
**12.25** Калыханка для самых маленькіх.
**13.10** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**14.10** Праект «Будучыня».
**14.40** «Грунвальд: 1410–2010. Інсцэнізацыя бітвы».
**15.40** МакраФон: «Сон-трава», канцэрт гурта «Троіца»: ч. 1.
**16.05** «Край светлых мрояў», дак. фільм, рэж. Юрый Гарулёў, 2008 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 20 серыя.
**18.00** «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г.
**18.55** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**19.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Англійская для дзяцей.
**19.45** Госць «Белсату».
**20.05** Еўропа сёння.
**20.30** Рэпартэр.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Беларускія лёсы: «Гастарбайтэр», рэпартаж, рэж. Сяргей Ісакаў, 2009 г., Беларусь.
**21.50** Суботні сеанс: «Ідэальны жыхар», трылер, рэж. Даг Кэмпбэл, 1999 г., ЗША.
**23.20** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял.
**00.05** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.15** Аб'ектыў.

## 17 ліпеня, нядзеля

### 1

**06.40** Фільм - казка. «Пітэр Пен» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал». Праграма пра войска.
**09.40** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**09.55** Фартыфікацыя.
**10.40** Відэафільм «Суцэльнасць слонімскай душы» цыкла «Зямля беларуская».
**10.55** Серыял па выхадных. Меладрама «Спроба Веры» (Расія). Заключная серыя.
**12.15** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Камедыя «Самая абаяльная і прывабная» (СССР).
**13.50** Сінематэка.
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Дак. цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна). Фільм «Браты і сёстры зорак».
**16.20** Прыгодніцкі сямейны фільм (ЗША).
**18.10** Суперлато.
**19.20** Моладзевая фантастычная камедыя «Пацалунак скрозь сцяну» (Расія).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Гістарычная меладрама «Забароненае каханне» (Вялікабрытанія).

### ОНТ

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Мая выдатная няня».
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.15** «Фазэнда».
**11.50** «Залатое цяля».
**15.00** Прэм'ера. «Бітвы спадчыннікаў».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Нядзельны «Ералаш».
**16.35** «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
**18.10** «Пры загадкавых акалічнасцях».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вялікая розніца». Лепшае.
**22.10** Брус Уіліс у фільме «16 кварталаў».
**23.55** «Yesterday live».

### СТВ

**07.00** Мультыплікацыйныя фільмы.
**07.25** «Я-вандроўца».
**07.50** «Кіно»: «Дом Вялікай Матулі». 2000 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Дэмбель непазбежны!» Серыял.
**13.25** «Добры дзень, доктар!».
**14.00** «Залатая калекцыя»: «Сем старых і адна дзяўчына». СССР, 1969г.
**15.35** Ток-шоў «Лёс» з доктарам Зміцерам Сайковым.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** Прэм'ера! «Геніяльны шпік».
**17.45** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** «Фільм тыдня»: «Стромкі татачка». Францыя, 2008 г.
**22.30** «Прафесійны бокс». Віталь Клічко - Сэмюэль Пітэр.
**23.35** «Арт-хаўс»: «Ноч на зямлі». ЗША - Германія - Францыя - Японія - Вялікабрытанія, 1991 г.

### ЛАД

**06.55** Прыгоды Агента 007. Баявік «Голдфінгер» (Вялікабрытанія).
**08.45** «Правы чалавека». Аўтарская праграма Яўгенія Новікава.
**09.00** Мір вашаму дому.
**09.10** Гаспадар.
**09.40** Фантастычны трылер «Кодар» (ЗША).
**11.20** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**11.40** Тэлебарометр.
**11.45** Нашы тэсты.
**12.20** Рэальны свет.
**12.50** Камедыйны серыял «Страхоцце Бэцці-3» (ЗША).
**13.40** «Жарсці па культуры».
**14.20** «Магія раяля». Музычны форум.
**15.25** Серыял «Маргоша» (Расія).
**19.00** Прыгоды Агента 007. Баявік «Голдфінгер» (Вялікабрытанія).
**21.00** «Спортлато 5 з 36».
**21.05** КЕНО.
**21.10** «Навіны надвор'я».
**21.40** Гістарычны блокбастар «Аляксандр» (ЗША).
**00.35** Культпрасвет.

### РОССИЯ

**07.00** «Пажар». 2010 г.
**09.20** «Хронікі здрады». 2010 г.
**11.00** Весці.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «З новай хатай!». Ідэі для вас.
**12.20** «Уся Расія».
**12.35** «Душачка».
**14.00** Весці.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.50** «Рамантыка рамanса».
**15.50** «Інакенцій Смактуноўскі супраць князя Мышкіна». Дакументальны фільм.
**16.45** «Чалавек без твару. Пенькоўскі».
**18.05** «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весці.
**20.35** Прэм'ера. «Я шчаслівая!». 2010 г.
**22.25** 1/4 фіналу першай лігі «КВЗ».

### НТВ

**07.40** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь. Мультфільм «Страказа і мурашка», «Ох і Ах».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ядзім дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.50** Прэм'ера. «Палымяны матор краіны» з дакументальнага цыклу «Уласны гонар».
**11.35** «Дачны адказ».
**12.35** «Хвацкія 90-я».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў з Веніямінам Смехавым. «Таямніца згубы Валера Чкалова».
**14.10** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**15.40** «Развод па-руску».
**16.30** «Следства вялі…».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.10** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «УГРО».
**19.00** Сёння.
**19.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «УГРО».
**20.15** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**21.45** Прэм'ера. «Маё апошняе першае каханне».
**23.20** «Гульня».
**00.10** «Пакаранне. Руская турма ўчора і сёння».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі рэйд. «Шаўковы шлях». Дзень 7-ы.
**09.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Кваліфікацыя.
**10.15** Плаванне. Чэмпіянат свету. Сінхронныя скачкі ў ваду. 10 м. Мужчыны. Папярэднія спаборніцтвы (Шанхай, Кітай).
**11.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Warm-up (Вялікабрытанія).
**11.30** Плаванне. Чэмпіянат свету. Сінхронныя скачкі ў ваду. 1 м. Жанчыны. Папярэднія спаборніцтвы (Шанхай, Кітай).
**12.00** Плаванне. Чэмпіянат свету. Сінхронныя скачкі ў ваду. 10 м. Мужчыны. Фінал (Шанхай, Кітай).
**13.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг».
**14.45** Аўтаспорт. Аўта ГП. Гонка 2-я.
**15.25, 23.45** Веласпорт. Нацыянальны тур. «Тур дэ Франс».
**18.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг».
**19.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы да 23 гадоў.
**21.15** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Часопіс.
**21.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. Германія. Фінал.
**23.50** Мотаспартовы часопіс.
**01.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Агляд.
**01.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы да 23 гадоў.
**02.00** Ралі рэйд. «Шаўковы шлях». Дзень 7-ы.
**02.15** Мотаспартовы часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 20 серыя.
**08.00** Калыханка для самых маленькіх.
**08.30** Рэпартэр.
**09.00** Еўропа сёння.
**09.25** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял: 7 серыя.
**10.15** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**10.40** Беларускія лёсы: «Гастарбайтэр», рэпартаж, рэж. Сяргей Ісакаў, 2009 г., Беларусь.
**11.10** Госць «Белсату».
**11.30** «Край светлых мрояў», дак. фільм, рэж. Юрый Гарулёў, 2008 г., Польшча.
**12.25** «Ідэальны жыхар», трылер, рэж. Даг Кэмпбэл, 1999 г., ЗША.
**13.55** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.25** «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г.
**15.20** «Костка» (Pestka), маст. фільм, рэж. Крыстына Янда, 1995 г., Польшча.
**17.00** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**17.25** «Час гонару», серыял: 38 серыя.
**18.15** Чаму дэмакратыя? 7 серыя: «Жалезныя лэдзі Ліберыі».
**19.05** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Англійская для дзяцей.
**19.50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.20** Вагон.
**20.25** Без рэтушы: «Рок назаўжды», дак. фільм, 2008 г., Беларусь: ч. 2.
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**21.50** Фільматэка майстроў: «Дэраў», біяграфічная драма, рэж. Джон Дэйвід Коўлз, 1991 г., ЗША.
**23.30** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.40** Тыдзень у «Аб'ектыве».

## Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8 029) 178 31 68, Вольга;
Бабруйск: (8029) 628 75 01, Вольга
Слуцк 8 044 755 66 48 Марына

### Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ____________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня
Всего
Кассир

**Для тых, хто прымае рашэнні!**
Новы час
www.novychas.org

ПРАВАКАЦЫЯ

# АМІНА — ПРАЕКТ «МАСАДА»?

Алег НОВІКАЎ

**Каб дыскрэдытаваць палітычныя рухі, сакрэтныя службы пачынаюць ствараць фальшывыя блогі лесбіянак і гомасэксуалістаў.**

Цяжка нават уявіць, якой вялікай была радасць актывістаў руху сэксуальных меншасцяў па ўсім свеце, калі неяк, блукаючы па сацыяльных сетках, яны натknуліся на акаўнт «A Gay Girl in Damascus». Яго вяла нейкая Аміна. Аўтарка сцвярджала, што яна жыве ў Дамаску і з'яўляецца заўзятым прыхільнікам альтэрнатыўнай сэксуальнай арыентацыі… Усе арабскія геі і лесбіянкі былі ў захапленні ад гераізму дзяўчынкі. Вядома, што Сірыя — краіна кансерватыўная, дзе падобныя паводзіны не вітаюцца.

На гэтым сюрпрызы не закончыліся. Аміна так яскрава і адкрыта апісвала свае раманы і флірты, што хутка падзяліла арабскую супольнасць LGBT (абрэвіятура ад англ.: лесбіянкі, геі, бісэксуалы, трансвестыты) на дзве фракцыі. Першыя казалі, што Аміна — актывіст руху. Трэба смела, як яна, ісці ў народ і пазіцыянаваць сябе як прадстаўніка іншай сэксуальнай арыентацыі. Другія, наадварот, заклікалі Аміну паводзіць сябе больш сціпла, прынамсі не выкладаць у сеціва апісанне эратычных сцэн, каб не наклікаць гнеў рэтраградаў на субкультуру. Аднак у выніку ўсё закончылася пшыкам: высветлілася, што ніякай Аміны не існуе.

Амінай была сям'я амерыканцаў Тома і Брыты МакМастэраў, якія жывуць у Шатландыі. Неяк парачка, па іх словах, вырашыла пазабавіцца і стварыла той правакацыйны блог. МакМастэры нават не ведалі магчымых наступстваў свайго прыколу. Аміна хутка стала сімвалам руху за сэксуальную эмансіпацыю на Усходзе. Тое, што на выхадзе смелая лесбіянка аказалася фантомам, нанесла ўдар па рэпутацыі сяброў LGBT. Нядзіўна, што на адрас МакМастэраў паступаюць пагрозы, у тым ліку і фізічнай расправы. Сярод абураных ёсць і тыя, каго Аміна паспела закахаць у сябе. Яна вяла вельмі актыўную амурную перапіску і нават прызначала спатканні.

Але гэта яшчэ кветачкі. Ёсць думка, што МакМастэры дзейнічалі ў рамках нейкага канспіратыўнага плана з глабальнай мэтай. Самі стваральнікі Аміны, сапраўды, вельмі не паслядоўна тлумачаць матывы, якія падштурхнулі іх завесці блог.




Спачатку Том МакМастэр казаў пра тое, што хацеў проста папрыкалвацца. Пазней у інтэрв'ю выданню «Guardian» Том адзначыў, што Аміна была для яго спробай напісання мяккай эратычнай прозы. Далей больш. Падчас спаткання з журналістам BBC Том раптам прызнаецца, што папросту хацеў данесці да публікі свае погляды на палітыку. Аказалася, каб цябе заўважылі, трэба прыкінуцца сірыйскай лесбіянкай.

Пакуль МакМастэр блытаецца ў матывах, публіка ўважліва аналізуе архіў запісаў Аміны і знаходзіць там шмат падазронага.

Напрыклад, назіральнікаў інтрыгуе маштаб эпісталярнай творчасці Аміны. Яна ўмудралася не толькі весці інтэрнэт-дзённік, але і фліртаваць на шматлікіх жаночых форумах, каментаваць палітычныя падзеі і г.д. Пры гэтым не проста нешта крэмзаць, а рабіць гэта на дастаткова высокім літаратурным узроўні. Адкуль такі талент у былога амерыканскага вайскоўца (Том МакМастэр служыў у войсках ЗША). Гэта стварае глебу для версіі пра тое, што МакМастэры — падстаўныя пешкі. На самай справе Аміна — прадукт большай колькасці людзей, аб'яднаных у рамках нейкай арганізацыі.

Арабскія актывісты LGBT мяркуюць, што такой арганізацыяй цалкам мог быць славуты ізраільскі «Масад». Як вядома, афіцыйны Тэль-Авіў не ў вялікім захапленні ад пераменаў у арабскіх краінах, якія стварылі мноства геапалітычных рызыкаў. У тым ліку шмат каму не падабаецца змена іміджу арабскага свету. Цяпер гэты рэгіён некаторыя эксперты нават называюць галоўнай лабараторыяй тэорыі дэмакратыі ў XXI стагоддзі. Рост сімпатый да арабаў вядзе да змены стаўлення Захаду ў палесцінскім пытанні. Усё часцей кажуць пра неабходнасць стварэння нармальнай палесцінскай дзяржавы, пра вывад ізраільскіх каланістаў. Адсюль узнікае лагічная патрэба дыскрэдытацыі новых грамадскіх рухаў у краінах Магрыбу. Менавіта адсюль, быццам, і растуць ногі праекту «Аміна».

На карысць такой версіі, па словах некаторых сайтаў, кажа тое, што Аміна ў рамках свайго блогу актыўна абараняла тэзіс пра тое, што апошняя хваля рэвалюцый у арабскіх краінах ёсць, па вялікаму рахунку, справа рук мясцовых геяў і лесбіянак. Адначасова Аміна стала агучвала старыя антысеміцкія міфы. Напрыклад, шмат распавядала пра палітычныя погляды адной са сваіх сябровак. Тая вельмі абураная падзеямі 11 верасня 2001 года і не хавае свайго адмоўнага стаўлення да Бен Ладэна і ісламскіх фундаменталістаў. Аднак пры гэтым лічыць, што ва ўсім вінаватыя самі амерыканцы, якія дапусцілі да ўлады масонаў і яўрэяў.

У чытача, які не вельмі арыентуецца ў палітыцы, складвалася думка пра тое, што за «арабскай вясной» (так называюць апошнія падзеі ў рэгіёне) стаяць геі-антысеміты. Увогуле, абсалютная большасць палітычных каментараў Аміны прысвечана актуальнаму становішчу на Блізкім Усходзе. Адсюль вядучы арабскі LGBT блог «Gay Middle East» робіць выснову, што стваральнікі Аміны праводзілі мэтанакіраваную палітычную кампанію.

Увогуле, «Gay Middle East», які першым высунуў версію, што ніякай Аміны не існуе, таксама пацярпеў за свае крокі. У інтэрнэце адразу з'явілася інфармацыя пра тое, што яго стваральнікі неяк звязаныя з Ізраілем. Тэма кантактаў з Ізраілем вельмі небяспечная ў шматлікіх арабскіх краінах. Мясцовыя крымінальныя кодэксы ўтрымліваць спецыяльныя артыкулы, якія караюць за кантакты з сіяністамі. Формы пакарання могуць быць розныя: ад турмы да смяротнага прысуду.

Сыходзячы з гэтага «Gay Middle East» заявіў, што ізраільскія спецслужбы наўмысна ставяць пад удар усю LGBT-тусоўку на Усходзе. З іншага боку, выкрыццё Аміны і так стварыла падставу для іх пераследу. Усе, хто кантактаваў у сеціве з Амінай, у вачах арабскіх спецслужбаў цяпер з'яўляюцца асобамі, якія падазраюцца ў стасунках з патэнцыйным агентам ізраільскай выведкі. Як піша нямецкае выданне «Junge World», зараз сярод сірыйцаў, якія «зафрэндзілі» Аміну, назіраецца вялікая паніка і жах наконт магчымага выкліку ў адпаведныя органы. Некаторыя з фрэндаў Аміны нават сышлі ў падполле.






## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

У спробе справіцца з шырокім эканамічным крызісам, Аляксандр Лукашэнка забараніў замежным кіроўцам адплачваць паліва беларускімі рублямі — зараз яны абавязаны плаціць валютай. Усе меры вельмі моцна нагадваюць апошнія дні існавання Савецкага Саюза і першую хаатычную пяцігодку эры посткамунізму. Яшчэ адна нагода наведаць Беларусь турыстам, што настальгуюць. А для беларусаў — працяг эканамічнага кашмару Лукашэнкі.

**«The Financial Times» (Вялікабрытанія)**

Яшчэ ў сакавіку жыхары краіны адзначалі, што пасля прэзідэнцкіх выбараў у снежні мінулага года іх «эканамічнае становішча» пагоршылася. Зараз жа падзенне дабрабыту можна ахарактарызаваць як «сапраўдны абвал».

**«Deutche Welle» (Германія)**

На што ў рэальнасці разлічвае беларускі лідар, можна толькі здагадвацца. Пасля двухмесячнай стагнацыі валютнага рынка беларускія ўлады працягваюць настойваць, што ўсталяваны курс долару ў раёне 5000 рублёў з'яўляецца «адзіным і раўнаважным», адмаўляючы патрэбу любых валютных інтэрвенцый для падтрымання гэтага курсу. Шчыра кажучы, уліваць у фінансавы рынак Беларусі па-ранейшаму няма чаго. Першы транш крэдыту антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС памерам у 800 мільёнаў долараў у Мінск паступіў, аднак, як сцвярджаюць у Саўміне, гэтыя грошы будуць залічаныя ў золатавалютныя рэзервы краіны. А гэта значыць, што для простых беларусаў долар будзе па-ранейшаму недаступны, затое валютчыкаў і надалей чакаюць добрыя часы.

**«Республика» (Казахстан)**

Канфрантацыя паміж Захадам і Беларуссю заканчваецца. Чыннікам гэтаму паслужыла заява прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі пра тое, што апазіцыйныя дзеячы, верагодна, будуць выпушчаны з турмы. Той факт, што ў дачыненні да Беларусі не ўведзены сур'ёзныя эканамічныя санкцыі, сведчыць пра тое, што заходнія сталіцы не сталі ў імя фасадных каштоўнасцяў ахвяроўваць геапалітычнымі інтарэсамі. А геапалітычны інтарэс палягае ў тым, каб не дазваляць занадта моцнага дрэйфу Беларусі ў расійскую арбіту ўплыву.

**«Regnum» (Расія)**

Апладысменты ў Мінску зараз забароненыя. Лукашэнку гоняць са сцэны, што зусім не падобна на «бурныя, працяглыя», памятныя нам па савецкіх часах. Патрыятычную авацыю бацьку сёння ладзіць адзін Пракопаў са сваім простым народам у колькасці двух-трох штук, і выглядае гэта так сумна, што зноў прыхоплівае сэрца і баліць душа.

**«Грани» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ІСПАНІЯ. БАСТЫЁН НАЦЫЯНАЛІСТАЎ НЕ МОЖА БЫЦЬ КУЛЬТУРНАЙ СТАЛІЦАЙ ЕЎРОПЫ

Буйны скандал выклікала рашэнне еўрапейскіх структур прызначыць баскскі горад Сан-Себасцьян культурнай сталіцай Еўропы 2016 года (ён будзе дзяліць гэты тытул разам з польскім Вроцлавам). Праблема ў тым, што прыкладна за тыдзень да рашэння мэрам гораду быў абраны Колда Ізагірэ, сябра баскскай левай нацыяналістычнай арганізацыі «Bildu», куды таксама ўваходзяць сябры партыі «Batasuna», забароненай за кантакты з тэрарыстамі ЕТА. У Іспаніі адразу з'явілася шмат ахвотнікаў (як правіла, з правых партый) забраць у Сан-Себасцьяна права быць сталіцай. На іх думку, той факт, што культурнай сталіцай Еўропы кіруе нацыяналіст, дыскрэдытуе саму ідэю еўрапейскай цывілізацыі, якая базуецца на гуманізме, а не гвалце. Апаненты ў сваю чаргу кажуць, што прыход Колда Ізагірэ ва ўладу мала што зменіў у гарадскім жыцці. Сан-Себасцьян, у якім пражывае 200 тысяч чалавек, заўсёды быў самым буйным горадам у Іспаніі, дзе людзі гавораць на баскскай мове. А сімпатыі да ідэі баскскай незалежнасці не замінаюць інтарэсу да еўрапейскай культуры, пра гэта сведчыць тое, што Сан-Себасцьян штогод прымае самы вялікі ў Еўропе джазавы фестываль «Jazzaldia». Акрамя таго, тут праводзіцца адзін з самых буйных у свеце кінафестываляў — так званы «Zinemaldia».

**Па матэрыялах «Gara» (Іспанія)**

### ГЕРМАНІЯ. НЕВЯДОМЫ СТРАЙК ГАСТАРБАЙТЭРАЎ У ГДР

У архівах усходніх нямецкіх спецслужб знойдзеныя цікавыя і раней не вядомыя матэрыялы пра забастоўку алжырцаў, якія працавалі ў ГДР у якасці гастарбайтэраў. Гэта падзея, пра якую было забаронена пісаць у прэсе, здарылася ў 1975 годзе. Тады 600 алжырцаў на васьмі будоўлях адмовіліся працаваць, патрабуючы большага заробку і ліквідацыі інстытуту куратараў. Адпаведна законам ГДР, да кожнага іншаземца, які стала жыў у краіне, быў прыстаўлены асабісты куратар, што адказваў за яго паводзіны перад адпаведнымі органамі. У выніку акцыі большасць патрабаванняў улады ГДР выканалі. Публікацыя матэрыялаў пра даўні страйк сталася нагодай узгадаць стан гастарбайтэраў ва ўмовах нямецкага сацыялізму. У ГДР кожны трэці, хто працаваў фізічна, быў гастарбайтэрам — галоўны чынам тое былі венгры, палякі, алжырцы, в'етнамцы і выхадцы з Мазамбіку. Самы цікавым пунктам кантракту была адмова ад кантактаў з немцамі. Гастарбайтэраў сялілі ў закрытыя інтэрнаты. У Штазі нават была памятка, што рабіць, каб не дапусціць шлюбу гастарбайтэра і немкі. За ўсю гісторыю ГДР было заключана не больш за 250 падобных шлюбаў. Аднак нягледзячы на цяжкія ўмовы, абсалютная большасць прадстаўнікоў трэцяга свету жадала застацца ў ГДР. Ёсць сведчанні пра спробу даць хабар памерам у 9 тысяч нямецкіх марак за працяг візы. Шмат хто пасля заканчэння візы пераходзіў на нелегальнае становішча. Так стварылася сапраўднае падполле. Гэтаму садзейнічала таксама тое, што маркі ГДР на радзіме гастарбайтэраў ніякай каштоўнасці не мелі. Даводзілася набываць долары ў інтурыстаў. Акрамя таго, каб мець дадатковыя грошы, тыя ж в'етнамцы стварылі сетку падпольных цэхаў, на якіх шылі дэфіцытныя джынсы. Эксперты мяркуюць, што позна ці рана Штазі арганізавала б нейкую маштабную зачыстку краіны ад іншаземных нелегалаў. Усе планы сарвала рэвалюцыя 1989 года.

**Па матэрыялах нямецкай прэсы**

### ЗША. ГАДАВІНА ВЫРАШЫЛА ЛЁС ШТАТАЎ

Нягледзячы на тое, што дата не юбілейная, у Амерыцы актыўна адсвяткавалі 148-ю гадавіну бітвы пры Гетэсбергу, у якой 1–3 ліпеня 1863 года войскі Паўночных штатаў разбілі армію Паўднёвых канфедэратаў. Гэта была крывавая сутычка. За адну першую гадзіну бітвы было забіта 8 тысяч чалавек. Нядзіўна, што калі прэзідэнт Джымі Картэр у 1978 годзе міры́ў егіпецкага прэзідэнта Садата і ізраільскага прэм'ера Бегіна, ён прапанаваў ім выехаць на нейкі час з рэзідэнцыі Кэмп-Дэвід у Гетэсберг. Картэр, відавочна, хацеў, каб удзельнікі перамоваў зразумелі, якім вялікім можа быць кошт вайны. Цяперашняя гадавіна прыйшлася на час папулярнасці канцэпцый альтэрнатыўнай гісторыі. Таму сённяшнія гісторыкі актыўна спрачаюцца на тэму, што было б, калі бітву выйгралі рабаўладальнікі? Большасць лічыць, што гэта быў бы канец амерыканскай дзяржаўнай мадэлі, пабудаванай на вялікай ролі грамадзянскай супольнасці. Таксама дамінаванне арыентаванага на сельскую гаспадарку Поўдня значыла б позні пачатак індустрыялізацыі краіны і магчымае вяртанне Злучаных Штатаў пад пратэктарат Вялікабрытаніі, якая, як вядома, падчас вайны спансіравала рабаўладальніцкія Штаты.

**Па матэрыялах амерыканскай прэсы**

### РАСІЯ. ТУР КАМІКАДЗЭ

Вядомы рускі нацыяналіст, экс-лідар забароненага «Славянскага саюза» Дзмітрый Дзёмушкін у гэтыя дні падарожнічае па Чачэнскай Рэспубліцы. Падчас свайго «турнэ» радыкальны патрыёт разгульвае па вуліцах Чачні ў футболцы з надпісам «Я рускі». «Цяпер на мне футболка з надпісам «Я Рускі», збіраюся аб'ехаць у ёй усю Чачню і пагаварыць са звычайнымі людзьмі. Мяркуецца, што паездка можа заняць да пяці дзён», — распавёў Дземушкін. Нацыяналіст таксама растлумачыў, што падчас адной з дыскусій з каўказцамі ў Маскве ён атрымаў запрашэнне наведаць ЧР і скарыстаўся ім. Дзмітрый адзначыў, што падчас падрыхтоўкі да паездкі ён сутыкнуўся з моцным супрацівам сілавікоў з Масквы: «Мне казалі, што, па іх інфармацыі, мне ў Чачні быццам збіраюцца адрэзаць галаву, і патрабавалі адмяніць паездку. Людзям з міністэрства Чачні, якія мяне запрасілі, таксама тэлефанавалі і пагражалі, казалі, што мы правакатары, што Дзёмушкін праходзіць па справе аб забойстве і таму падобнае», — распавёў нацыяналіст. У інтэрнэце з'явілісся першыя нататкі Дзёмушкіна з Грознага. Па яго словах, у Чачні мінакі падазрона глядзяць на яго надпіс на майцы, аднак не чапаюць, паколькі вакол увесь час круцяцца нейкія людзі ў цывільным.

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

ДЫКТАТАР

# ХТО ЗМЕНІЦЬ ЧАВЕСА?

**Іван БІЧ**

**Прызнанне Уга Чавеса, што ён хворы на рак, выклікала шмат спекуляцый наконт яго магчымага пераемніка і будучыні створанай ім палітычнай мадэлі.**



Прыкладна 20 дзён уся Венесуэла жыла ў няведанні, што здарылася з Уга. Нечаканая гаспіталізацыя прэзідэнта падчас візіту на Кубу, супярэчлівая інфармацыя пра вынікі аперацыі выклікалі шмат плётак. «Пацыент хутчэй здаровы, чым мёртвы», — такім быў лейтматыў афіцыйнай прэсы. «Пацыент хутчэй мёртвы, чым жывы», — сцвярджалі апазіцыйныя СМІ са спасылкай на выданні Фларыды, якія першыя распаўсюдзілі інфармацыю пра тое, што ў Чавеса — смяротная хвароба. У выніку памыліліся і першыя, і другія. Чавес, які вярнуўся ў Каракас, жывы. Але яму пастаўлены жудасны дыягназ — рак.

Нават калі хвароба ў хуткім часе не праявіць сябе, палітычную кар'еру Уга шмат хто лічыць скончанай. Толькі фанатык у такім стане будзе займацца дзяржаўным менеджментам. Тым больш, што палітычны каляндар спрыяе для сыходу на пенсію: цяперашняя кадэнцыя прэзідэнта заканчваецца ў наступным годзе. Самі ўлады пра сцэнар сыходу Чавеса ўпарта маўчаць. Аднак дэбаты наконт асобы, якая здольная змяніць Уга, ужо актыўна ідуць.

Крытэрыі адбору вельмі высокія. Уплывовая газета «El Universal» піша: «Упершыню ў лагеры Чавеса пануе разгубленасць. Канстатуюць, што магчымы канец працэсу, які пачаў Чавес. У камандантэ няма пераемніка. А калі пачаць яго абіраць, база чавістаў можа раскалоцца. Існуюць відавочныя супярэчнасці паміж яе дзвюма галоўнымі фракцыямі: простыя людзі, якія галасуюць за Чавеса, і маладая бюракратыя, якой Чавес дазволіў кіраваць краінай».

Акрамя згаданых фракцый існуе яшчэ адна. Гэта сям'я. У аўтарытарных краінах Лацінскай Амерыкі даўно існавала практыка перадачы ўлады ад бацькі да сына (клан Самосы кіраваў Нікарагуа на працягу амаль 60 гадоў). Хаця Чавес, у адрозненні ад таго ж Самосы, адносіць сябе да палітыка левага спектру, у святле апошніх падзей цалкам выключаць такога варыянту нельга. Узгадаем схему нядаўняй перадачы ўлады на Кубе, якую абагаўляе венесуэльскі гарант. Калі Фідэль Кастра адчуў, што не можа з-за здароўя цягнуць лямку, ён перадаў функцыі прэзідэнта малодшаму брату Раулю.

У гэтым плане найбольш перспектыўным кандыдатам з'яўляецца Адан Чавес, старэйшы брат Уга. Ён — па прафесіі матэматык — лічыцца палітычным настаўнікам Уга. Цяпер займае пасаду аднаго з губернатараў, а таксама персанальна адказвае за кантакты з Гаванай, дзе працаваў паслом. Адан вядомы радыкальнымі левымі пракубінскімі поглядамі, што не вельмі падабаецца памяркоўным чавістам.

Дастаткова яскравай фігурай у венесуэльскай палітыцы з'яўляецца прэзідэнцкая дачка ад першага шлюбу Марыя Габрыэла Чавес. Паколькі сам Чавес разарваў шлюб з жонкай, Марыя Габрыэла вымушана выконваць функцыі першай лэдзі. Па словах маці, «дзяўчынка — копія бацькі».

Перадача ўлады па прынцыпу крыві наўрад ці будзе адназначна падтрымана з боку вертыкалі. У адміністрацыі Чавеса хапае адукаваных і вопытных палітыкаў. Магчыма, некаторыя з іх прабуюць стаць венесуэльскімі «казулінымі».

Галоўны прэтэндэнт — Эліас Хаўа, віцэ-прэзідэнт, былы выкладчык сацыялогіі ва ўніверсітэце — адзін з самых блізкіх людзей да Чавеса. 41-гадовы Эліас лічыцца асноўным аўтарам новай т. зв. баліварскай канстытуцыі. Яшчэ адзін магчымы прэтэндэнт — 48-гадовы Нікалас Мадура, міністр замежных спраў. Яго жонка Сілія Флорэс — першая ў гісторыі краіны жанчына-спікер нацыянальнай асамблеі. У спісе верагодных пераемнікаў таксама згадваюцца Рафаэль Рамірэс, міністр энергетыкі, дырэктар венесуэльскага «газпраму» — карпарацыі «Petryleos de Venezuela (PDVSA) — Дзіёсдада Кабела — дэпутат парламента, якому Чавес асабіста абавязаны выратаваннем падчас путчу 2002 года. Нарэшце, апошнім часам нашмат выраслі фішкі Тарэка эль-Аісамі — дырэктара МУС, які праславіўся падаўленнем бунту ў адной з турмаў.

Усім пералічаным палітыкам не хапае аднаго — харызмы. Праблема ў тым, што цяперашняя ўлада мае яскрава персаналісцкі характар. Увесь дзяржаўны працэс круціцца вакол адной асобы. Тыя, хто ўваходзяць у атачэнне Чавеса, знаходзяцца ў цені лідара, яны малавядомыя грамадству.

Пра гэта добра сведчаць вынікі сацыялагічнага апытання, якое правёў Венесуэльскі інстытут аналізу дадзеных (IVAD). У якасці фокуснай групай былі абраны лаяльныя рэжыму венесуэльцы. Рэспандэнтам задалі пытанне, за каго яны б яны галасавалі, калі б прэзідэнцкая партыя правяла праймерыс пераемніка Чавеса. У такім выпадку Эліас Хаўа атрымаў 2,6 працэнтаў, Дзіёсдада Кабела — 2,5 працэнта. 36 працэнтаў апытаных адказалі, што не вераць у тое, што Чавес сыдзе з пасады, 57 працэнтаў — папросту не зразумелі пытання.

Яшчэ больш цікавыя вынікі апытання, які правяло іншае агенцтва «Consultores 21», адпаведна якому, калі б нехта з атачэння Чавеса пайшоў на выбары, то ён у лепшым выпадку набраў бы не больш за 35–37 працэнтаў. У той жа час за лідараў апазіцыі — яны больш харызматычныя персоны — гатовыя галасаваць каля 41 працэнта. Зноў жа адбівацца слабая вядомасць мандарынаў Чавеса.

Як піша «El Universal»: «Чавес цалкам змяніў палітычную культуру ў Венесуэле на карысць персаналізацыі ўлады. Аднак аказалася, што мадэль, якая прызнае выключна аднаго лідара і ставіць асабістую адданасць вышэй за інстытуцыйныя абавязкі, правальная. Без Чавеса «chavismo» як палітычны рух не мае шансаў. Разуменне гэтага стане ключавой тэмай выбараў у наступным годзе».

Нарэшце, апошні палітычны полюс, які можа паўплываць на выбар пераемніка — Адзіная сацыялістычная партыя Венесуэлы (PSUV) і блізкія да яе грамадскія рухі. Партыя была створаная ў 2006 годзе падчас прэзідэнцкай кампаніі. Аднак пры гэтым партыйны базіс дастаткова крытычна ставіцца да асоб з каманды Чавеса, якіх трымае за рэфармістаў і сабатажнікаў рэвалюцыйнага працэсу. Гэтым патэнцыйна можа скарыстацца старэйшы брат Чавеса, які лічыцца левым артадоксам. Але трэба памятаць, што PSUV стварылі адміністратыўным метадам, і ў дадатак па рэцэпту салянкі: сюды запісалі прадстаўнікоў шасці левых партый з рознымі ідэйнымі платформамі. Штучнасць аб'яднання і слабы ідэйны складнік здольныя выклікаць у PSUV у любы час цэнтрабежныя працэсы.

Адным словам, сыход Чавеса пагражае дысбалансам груповак ва ўладным лагеры. Да гэтага яны проста не гатовыя. Таму, каб захаваць стабільнасць, Чавеса могуць трымаць на пасадзе да самага апошняга дня. Аднак гэта не значыць, што выбары пройдуць як па маслу. Старэйшы брат Чавеса ўжо заявіў, што не выключае ўжывання падчас кампаніі зброі, «каб захаваць уладу». Акрамя таго, нават новы прэзідэнцкі мандат не вырашае праблемы перадачы ўлады. Хворы Чавес як гадзіннікавая бомба. Калі раптам, не дай Бог, нешта здарыцца, краіну чакае вакуум улады. А ў дадатак, як спадчына культу асобы Уга, яшчэ і крызіс легітымнасці ўлады.

СПОРТ

# У ФУТБОЛА ЖАНОЧАЯ БУДУЧЫНЯ

Алег НОВІКАЎ

**Чэмпіянат свету па футболу сярод жанчын, які праходзіць у Германіі, лічаць рубежным у гісторыі жаночага футболу.**



Тое, што адбываецца зараз у Германіі, вельмі сімвалічна. Жаночы футбол у гэтай краіне забаранялі найчасцей. Спачатку нацыянал-сацыялісты. Пасля вайны — кансерватары. У 1955 годзе, праз год пасля таго, як немцы сталі чэмпіёнамі свету па футболу, жаночыя клубы рашэннем федэрацыі распусцілі. На рашэнне паўплываў менавіта трыумф нацыянальнай зборнай. Лідары ФРГ лічылі перамогу футбалістаў фактарам адраджэння нямецкай мужчынскай годнасці, якую прынізілі ў 1945-м. Каб не ўзнікала супярэчнасцяў, жаночы футбол выжашлілі паставіць па-за законам. У дадатак гэта адпавядала грамадскаму разуменню ролі жанчыны: «Kinder, Kuche, Kirche».

Забарону знялі праз 4 гады. Федэрацыю жаночага футболу заснавалі толькі ў 1970 годзе (мужчынская існуе з 1900-га), пасля таго, як сацыял-дэмакратычны канцлер Вілі Бранд дамогся папраўкі ў Асноўны закон, які забараняў палавую дыскрымінацыю. У 1982 годзе паўстала першая нацыянальная зборная ФРГ.

Падобны шлях жаночы футбол прайшоў ва ўсёй Еўропе. На пачатку XX стагоддзя ў асяродку брытанскіх дактароў узнікла тэорыя, якую пазней назвалі «англійская хвароба». Яе аўтары сцвярджалі, што скокі на футбольным полі і ўдары мяча могуць нанесці шкоду жаночым палавым органам. Акрамя таго, лічылася, што дэфіле ў майках і трусах шкодзіць эстэтычнай прыродзе кабеты. Казалі, што футбол ператварае жанчыну ў мужчыну, разбурае яе мацярынскія пачуцці. У 1953 годзе з'явілася кніга галандскага псіхолага Фрэдэрыка Бёйтэндэйка (Frederik J. J. Buytendijk) «Футбол. Псіхалагічнае вывучэнне вырашальнай ролі». Аўтар даводзіў, што гульня ў мяч — гэта праява «мужчынскай агрэсіі» супраць «жаночай адаптацыі».

Нават калі на хвалі руху 1968 года пачалася эмансіпацыя жанчыны, старыя ўстаноўкі захаваліся. Так, спачатку футбольныя матчы з удзелам жанчын цягнуліся 70, а не 90 хвілін. Былі прыдуманы спецыяльны жаночы футбольны мяч, больш лёгкі за той, які ганяюць мужчыны. Футбалісткам нават было дазволена гуляць рукою. Лічылася, што такім чынам спартсменка можа перастрахавацца ад удару мяча ў твар, каб той не папсаваў жаночую прыгажосць. Нарэшце, правілы патрабавалі, каб сезон жаночых футбольных гульняў пачынаўся ў сакавіку і заканчваўся ў кастрычніку. Прычына? «Зіма — гэта цяжкі час для слабага жаночага арганізму», — гаварылася ў памятцы адной з еўрапейскіх футбольных асацыяцый.

Цікава, што дыскрымінацыя жаночага футболу мела месца толькі на прагнійшым Захадзе. У савецкім блоку да гэтага віду спорту ставіліся дастаткова спакойна. У той жа ГДР забаўка не вельмі віталася, аднак ніхто не забараняў юным фраў ганяць мяч. Магчыма, з-за таго, што ў камуністаў былі іншыя ўяўленні пра ролю жанчыны, якая мела права і боршч варыць, і трактарам руліць, і адпор імперыялістам даць. А ў Паўночнай Карэі жаночы футбол увогуле з'яўляецца амаль дзяржаўным відам спорту.

Поспехі жаночага футболу ў апошнія гады (першы чэмпіянат па футболу сярод жанчын адбыўся толькі ў 1991 годзе ў Пекіне) відавочныя. Аднак узніклі новыя выклікі. Грамадства паступова пагадзілася з фактам існавання жаночага футболу, аднак масавым відам спорту, спартовай рэлігіяй ён, відавочна, не стаў. Больш таго — вакол жаночага футболу сфармаваліся новыя забабоны і стэрэатыпы.

«Мужчыны паважаюць жаночы футбол, аднак яны яго не вельмі жадаюць», — робіць рэзюме газета «Bild». Выданне піша, што для шматлікіх мужчын жаночы футбол, па вялікаму рахунку, гэта exhibition games — эратычныя здымкі арыгіналак ад спорту.

У дадатак чамусьці гэты від спорту лічыцца спортам лесбіянак, хаця ніякай статыстыкі на гэты конт ніколі ніхто не збіраў. На думку журналістаў, сітуацыя тлумачыцца вельмі проста. Гомасексуалізм у жаночым футболе ніколі не падпадаў пад табу, у адрозненні ад мужчынскага.

Вялікі ўплыў на ўяўленні пра жаночы футбол як гульню другога гатунку аказвае культура балельшчыкаў. Быць футбольным фанатам у традыцыйным разуменні — значыць абавязкова напіцца напярэдадні або пасля гульні. Агрэсіўнасць на полі павінна адпавядаць агрэсіўнасці на трыбунах. Цяжка ўявіць жанчыну — аматара футболу, якая даводзіць сябе да падобнай кандыцыі. Некаторыя ў гэтай сувязі нават кажуць, што жаночы і мужчынскі футбол — гэта розныя дысцыпліны. Для жаночага футболу характэрныя больш камбінацый і дынамікі. У мужчынскім вітаецца сілавы стыль. Аднак чамусьці сапраўдным футболам лічыцца другі варыянт.

Так ці інакш, турніры футбалістак пакуль не выклікаюць той ступені істэрыкі, якую заўсёды чай можна назіраць падчас Кубка свету або чэмпіянату Еўропы ў мужчынскім футболе.

Аднак усё мяняецца. Немцы шмат папрацавалі над тым, каб надаць цяперашняму чэмпіянату свету ў ФРГ статус чагосьці вельмі важнага. На матчах нямецкай зборнай можна пабачыць першых асобаў дзяржавы, уключна з канцлерам Ангелай Меркель. Па вялікай колькасці рэкламы можна казаць пра інтарэс да чэмпіянату з боку спонсараў. Аптымізм унушаюць сацыялагічныя апытанні: 23 працэнты прыхільнікаў футболу ў Германіі гатовыя глядзець жаночы футбол (на жаль, 40 працэнтаў рашуча супраць такой прапановы).

Ці ёсць нейкі шанс, што калі-небудзь жаночыя матчы будуць збіраць такую аўдыторыю, як сустрэчы мужчынскіх зборных? Вялікае пытанне ў сувязі з тым, што 80 працэнтаў наведвальнікаў стадыёнаў — гэта мужчыны. Пакуль прапорцыя не пачне мяняцца, наўрад ці ў гэтай сферы адбудуцца сур'ёзныя змены. Па падліках, сярэдняя колькасць наведвальнікаў матчаў жаночай Бундэслігі — прыкладна 700 чалавек. У мужчынскай — каля 40 тысяч. З іншага боку, усе падставы для такой тэндэнцыі ёсць. Так, у ФРГ налічваецца каля мільёна футбалістак. У ЗША пасля кубка свету 1994 года ўзнік цэлы сегмент жаночага футболу. Футбол сёння самы любімы жаночы від спорту ў Штатах.

Не дарма Fifa абвясціла, што «ў футбола жаночая будучыня». Аднак да гэтай будучыні, здаецца, далёка. Падчас турніру Федэрацыя ўвяла новыя правілы праверкі футбалістак. Перад матчам спецыяльная камісія будзе глядзець, ці не спрабуе за жаночую каманду згуляць хлопец. Адразу шмат хто пабачыў тут праяву сэксізму. Атрымліваецца, што, у любым выпадку, мужчыны гуляюць у футбол лепш за жанчын.

Як тут ні прыслухацца да правакацыйнай ідэі групы спартовых гісторыкаў, якія выступаюць за тое, каб увогуле адмовіцца ад палавых забабонаў у футболе. Стары добры футбол не ведаў катэгорый «жаночы» і «мужчынскі». Таксама футбалісты не дзяліліся на юніёраў і дарослых. Летапісы апісваюць гульню ў мяч у старажытнай Англіі як забаўку, у якой удзельнічалі ўсе, хто жадаў: дзеці, мужчыны, жанчыны, старыя. Магчыма, такія правілы захаваліся да нашых часоў, калі б не жорсткія маральныя нормы Віктарыянскай Англіі. У той час шляхі жаночага і мужчынскага футбола разышліся. Можа, час ім зноў перакрыжавацца?

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### МАРСЕЛЬ ХОФ



Намеснік мэра аўстралійскага горада Сідней, Хоф вырашыла пашырыць значэнне слова «халакост», якое зараз ужываецца ў дачыненні да генацыду яўрэйскага народу ў часы нацыстаў. Па словах Хоф, існаваў таксама халакост аўстралійскіх тубыльцаў, які праводзілі еўрапейцы. Менавіта з ініцыятывы Марсель гарадскі савет прыняў сенсацыйнае рашэнне, адпаведна якому забараняецца ўжыванне тэрміну «еўрапейскае прыбыццё» — так яшчэ ўчора называўся працэс каланізацыі Аўстраліі брытанцамі. З цяперашняга часу гэты працэс будзе называцца «інтэрвенцыя». «Трэба прызнаць, што мы не былі проста каланістамі, мы былі акупантамі, — заявіла Хоф. Яна таксама дадалп, што не ведае іншага слова, якое так добра характарызуе феномен знішчэння тубыльцаў еўрапейцамі акрамя «халакост», які, дарэчы, па яе словах, працягваецца. Сапраўды, працягласць жыцця аўстралійскіх тубыльцаў адна з самых малых у свеце. Рашэнне сіднейскіх уладаў выклікала цікавую рэакцыю грамадства. Правая прэса сцвярджае, што абарыгены самі вінаватыя ў сваіх праблемах. Сярод іх шмат алкаголікаў і таксікаманаў. Левая прэса, наадварот, кажа, што Хоф сваімі размовамі пра «акупацыю» гуляе на руку вугальным кампаніям, якія паклалі вока на тубыльскія землі і думаюць, як ім выгнаць адтуль плямёны. Для гэтага прамыслоўцы лабіруюць закон аб перасяленні абарыгенаў з рэзервацый у гарады, дзе ім быццам гарантуюць выратаванне ад халакосту.

### АЗАТ ПЕРУАШАЎ



Казахскаму бізнэсмэну Перуашаву ўлады дaручылі важную місію. Ён будзе ствараць ілюзію існавання ў краіне двухпартыйнай сістэмы. Пра тое, што Назарбаеву трэба стварыць сабе спарынг-партнёра, пачалі шмат гаварыць пасля апошніх прэзідэнцкіх выбараў. Тыя выбары апазіцыя байкатавала, а альтэрнатыўныя кандыдаты, якіх удалося знайсці, былі відавочна падстаўнымі. Не дзіўна, што на Астану цісне Захад. У выніку вырашана, што наступны парламент будзе шматпартыйным. Новы закон дазволіць любой палітычнай партыі, якая заняла другое месца на выбарах, стаць парламенцкай, нават калі яна не пераадолее ўсталяваны 7-працэнтны выбарчы бар'ер. Нагадаем, што цяпер усе месцы ў парламенце належаць прэзідэнцкай партыі «Нур Атан». Другой партыяй у краіне лічыцца апазіцыйная сацыял-дэмакратычная партыя «Азат». Каб яна не трапіла ў парламент, і пачаўся кастынг на партыю канструктыўнай апазіцыі. Ёй стала партыя «Ак Жол», у кіраўніцтве якой адбыўся пераварот на карысць пераабрання старшыні, якім 2 ліпеня і стаў Перуашаў. Ці клюне электарат на новыя хітрыкі ўлады, будзе вядома ў наступным годзе, калі пройдуць парламенцкія выбары.

### ВІКТАР ОРБАН



Прэм'ер-міністр Венгрыі Орбан — лідар правай кансерватыўнай партыі — праявіў сябе як заўзяты аматар Льва Троцкага. Венгерскі палітык пазычыў у «дэмана рэвалюцыі» ідэю працоўнай арміі. Такім чынам, адпаведна плану ўраду, сацыяльная дапамога па беспрацоўю будзе выдавацца на працягу трох месяцаў. Калі асоба не зможа за гэты час працаўладкавацца, яго чакае павестка ў спецыяльнае фармаванне. Гэта фармаванне будзе займацца будаўніцтвам аб'екту нацыянальнага значэння — стадыёну ў горадзе Дэбрэцэн. Натуральна, узнікае пытанне, што рабіць з тымі, хто жыве занадта далёка ад будоўлі? Выхад ёсць! Яны будуць жыць у спецыяльным лагеры каля Дэбрэцэна. Новая рэформа можа мець цікавыя наступствы ў сувязі з тым, што беспрацоўе ў Венгрыі носіць нацыянальны характар. Самая высокая квота беспрацоўных сярод цыган. У тое, што яны пагодзяцца на прафесію будаўніка, слаба верыцца. Усяго ў армію беспрацоўных можа быць мабілізавана каля 400 тысяч чалавек. Менавіта столькі венграў зараз жывуць на сацыяльную дапамогу.

ТЭХНАЛОГІІ

# САЦЫЯЛЬНЫ НЕРАТ

## ЦІ МАГЧЫМАЯ Ў БЕЛАРУСІ ФЭЙСБУК-РЭВАЛЮЦЫЯ?

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Фрустрацыя беларускага грамадства, выкліканая жорсткім прыдушэннем мітынгу 19 снежня 2010 года, перайшла ў калектыўную дэпрэсію вясной, калі пачаліся суды над палітвязнямі і зацяжны валютны крызіс. Своеасаблівы выхад з гэтай дэпрэсіі быў прапанаваны ў пачатку чэрвеня маладымі карыстальнікамі сацыяльнай сеткі «ВКонтакте».**

Беларускія настроі нязгоды займелі свой графік і месца («кожную сераду на цэнтральнай плошчы твайго гораду»), канцэпцыю («маўклівы пратэст і непрацяўленне злому») і ўпершыню за апошнія 20 гадоў страцілі мінскую прапіску, стаўшы агульнанацыянальнымі. Журналісты ў захапленні — сацыяльныя сеткі за лічаныя тыдні здзейснілі тое, чаго не змаглі дамагчыся некалькі пакаленняў апазіцыйных палітыкаў і іх тэхнолагаў... Ці мела б Беларусь (а да яе — Туніс, Егіпет, Лівія) такі цывілізацыйны шанец, калі б у не такім ужо ў далёкім 2003-м годзе аднаго здольнага студэнта Гарварда не пакрыўдзіла дзяўчына?

Мы селі на прыгарадны аўтобус, каб ехаць у Корал-Рыдж мол. Нас — чатыры дзяўчыны, і мы з розных кантынентаў. Пола — аргенцінка, Гада — егіпцянка, Аня (нягледзячы на імя) — немка, ну і я. Амерыканскія гарадскія аўтобусы — гэта такія домікі з казкі Шарля Пяро: таргані за вяровачку — дзверы і адчыняцца: па ўсім салоне працягнутыя драты, спалучаныя з кабінай кіроўцы. Прыкладна праз паўгадзіны язды і нам трэба, не праміргаўшы патрэбны прыпынак, прарабіць гэтую аперацыю. А праміргаць нескладана: універсітэцкі гарадок хутка заканчваецца, і паабапал дарогі відаць нізкія ангары загарадных крамаў, рэстарацый і сэрвісаў. Самы вялікі ангар — наш: гандлёва-забаўляльны цэнтр для адпачынку і шопінгу аяванскіх фермераў, іх жонак і дзетак. Аня торгае за вяровачку.

Зусім не шопінг — прычына нашай сюды вылазкі. Мы не супадаем у густах — а некаторыя з нас і ў памерах з жонкамі аяванскіх фермераў, вопратка тут пераважна спартовая, каб купіць нешта «гэткае» тутэйшыя дзяўчаты з прэтэнзіямі выпраўляюцца ў «Шыкага» — гэта ўсяго тры гадзіны язды па хайвэі, калі, канешне, гнаць 100 міляў (130 кіламетраў) на гадзіну — а яны так і ганяюць, нават рэйсавыя аўтобусы: («Мэм, толькі дазволеная хуткасць, мы — рэспектабельны перавозчык!»). Мы выбраліся ў мультыкінатэатр на прэм'еру «Сацыяльнай сеткі» Дэвіда Фінчара. Хоць, здаецца, і тут мы ў густах не супадаем: гледачоў у залі не больш за дзясятак. Мы ўладкоўваемся з напоямі ў крэслах-гайдалках, глядзім і гайдаемся.




### Ад Гутэнберга да Цукерберга

Знаёмы публіцыст даў усяму працэсу развіцця сусветнага кнігадруку ёмкае азначэнне: ад Гутэнберга да Цукерберга. І ўшанаваны шэрагам узнагародаў фільм Фінчара толькі пацвярджае правамернасць згадваць другое прозвішча побач з першым. Мастацкі фільм «Сацыяльная сетка» заснаваны на рэальных падзеях — а менавіта вынаходніцтве 20-гадовым студэнтам Гарварду Маркам Цукербергам першай сацыяльнай сеткі facebook.com.

Фільм зацікавіў нас кожную па-свойму. Аня ў інтэрнэце амаль адсутнічае. Яна перакананая, што скайп і электронная пошта дастаткова звязваюць яе з рэштай свету. Яна прыйшла на фільм, бо хоча ведаць у твар ворага сваёй прыватнасці. Гада — егіпецкая Фэйсбук-актывістка, ёй цікава зірнуць на тое, як ствараўся механізм любімай лялькі. Пола прыйшла на фільм як падшыты алкаголік на экскурсію па піўзаводзе: напярэдадні яна выдаліла свой акаўнт у ФБ, бо палічыла, што віртуальнае сумоўе забірае зашмат яе часу. Я зарэгістраваная ў Фэйсбуку, і тут, у ЗША, усё актыўней зазіраю на сваю старонку: у сацыяльнай сетцы працей падтрымліваць сувязь як з пакінутай на час радзімай, так і з новымі англамоўнымі сябрамі. Я прыйшла на фільм пад уражаннем ад «Байцоўскага клубу» — самай вядомай карціны таго ж рэжысёра, у чаканні чарговага дыгназу свайму пакаленню.

Фільм Фінчара цікавы ўжо тым, што распавядае пра падзеі, якія адбыліся ўсяго сем гадоў таму, і ўдзельнікі якіх — маладыя людзі, якім цяпер па 26–27 гадоў, у жанры канала «Дыскаверы» — як пра знакавую гістарычную падзею мінуўшчыны. Некалькі студэнтаў Гарварда запусцілі сайт, на якім людзі маглі змяшчаць інфармацыю пра сябе і камунікаваць. Наватарства сайту было ў тым, што людзі на ім прадстаўленыя не паасобку, а праз свае сацыяльныя сувязі: школу, сям'ю, сяброў... Тут можна было лёгка знайсці людзей, якіх, здавалася, страціў назаўсёды (праграмісты былога Савецкага Саюза потым акцэнтавалі гэтую магчымасць сацсетак у нашумелым праекце «Аднакласнікі»). У 2006 годзе Фэйсбук перастаў быць рэсурсам амерыканскіх універсітэтаў і пашырыўся на ўвесь свет. У сакавіку 2011 года колькасць зарэгістраваных карыстальнікаў перавысіла 700 мільёнаў...

Як толькі праект «Фэйсбук» стаў паспяховым, яго галоўныя стваральнікі — фінансіст Эдуарда Северын і праграміст Марк Цукерберг рассварыліся, вынікам чаго стаў судовы працэс. Апроч таго, з Цукербергам судзіліся іншыя студэнты Гарварда — браты Уінклвасы, якія сцвярджалі, што юны геній скраў іх ідэю віртуальнага клуба для абраных студэнтаў Гарварда.

### Цукерберг — герой?

У аснову фільма «Сацыяльная сетка» лягла кніга Бена Мездрыча «Мільярдэры мімаволі» — дакументальная толькі напалову. Гісторыя судовых працэсаў супраць Цукерберга ў ёй містыфікуецца. Паводле аўтара, Марк Цукерберг — герой новага часу, чалавек, які зарабіў вялізарныя грошы ўласным інтэлектам, але абсалютна не карыстаецца выгодамі мільярдэрства. У фільме «Сацыяльная сетка» рэжысёр зрабіў акцэнт менавіта на самім феномене новых камунікацый: слоган фільма — «Немагчыма завесці паўмільярды сяброў, не нажыўшы ніводнага ворага».

Здаецца, што тут глядзець? Але Фінчар ператварае начныя няспанні маладога праграміста і будні IT-спецыялістаў у расцягнутых спартовых швэдрах, якія яўна спадабаліся б жонкам аяванскіх фермераў, у вострасюжэтную маладзевую драму.

Чырвонай ніткай праз фільм праходзіць думка, што Фэйсбук, як і ўсё вялікае ў гэтым свеце, быў створаны *«из-за девчонки»*. Шэршэ ля фам — яшчэ падчас уступных тытраў галоўнага героя кідае дзяўчына. Перад фінальнымі тытрамі самы малады мільярдэр планеты сядзіць перад экранам кампутара і ярастна абнаўляе старонку: ужо стаўшы сусветнай знакамітасцю, ён — звычайны юзер сваёй сеткі — дасылае ёй запыт на даданне ў сябры. Дзеля ейнага адзінага «Запыт прыняты», маўляў, і быў задуманы самы неверагодны сацыяльны праект пачатку тысячагоддзя. Амаль ванегутаўская філасофія.

«Я лічу, Цукерберг — герой!» — запярэчыла Пола ў адказ на маю заяву, што Марк Цукерберг — злы геній, Фэйсбук — новая антыўтопія, а «Сацыяльная сетка» — фільм-папярэджанне. Пола — маладая вучоная, яна схіляецца перад прагрэсам, а новы тып камунікацыі — гэта, безумоўна, прагрэс. Я, гуманітарый, магу думаць пра гэта што заўгодна. У Гады наша дыскусія выклікае іншыя пытанні: «Як можна стаць мільярдэрам, калі ўсё, што адбываецца ў Фэйсбуку, — бясплатна?» — задае яна лагічнае пытанне. Хто-хто, а яна ведае цану сацыяльным сеткам: за ўвесь час сваёй Фэйсбук-актыўнасці, яна плаціла хіба што егіпецкаму правайдэру за падключэнне да інтэрнэту.

«Вельмі проста. Кожны профіль у Фэйсбуку каштуе мінімум адзін долар» — тлумачыць Пола. Вось ты, Марыя, маеш у профілі карцінку ў чырвоным швэдры. «У маім любімым!» — шырока пасміхаюся я. «Для Фэйсбука гэта вельмі каштоўная інфармацыя, якую можна дорага прадаць стваральнікам кантэкстнай рэкламы! — урачыста абвяшчае сяброўка. — Гэта значыць, табе можна паказваць чырвоныя машыны, чырвоныя сукенкі... А табе, Гада — бірузовыя, як твая хустка!»

А мы ж яшчэ дадаём туды свае фота, відэа, тэксты... У рэсурсу, які залучыў у сябе ўжо шостую частку жыхароў планеты, — вялізныя перспектывы, у яго вераць інвестары. На сёння Фэйсбук каштуе каля 60 мільярдаў даляраў, чвэрць з якіх належыць 27-гадоваму Марку.

### Фэйсбук — рэвалюцыя

Магчыма, Фінчар і мае рацыю, і 20-гадовым Цукербергам на парозе яго вынаходніцтва рухала піва і злосць на жаночы пол. Але, як і ў Егіпце, у Беларусі Фэйсбук — і яе кірылічны аналаг «ВКонтакте» — рухаюцца зусім іншым тыпам лібіда. У краінах аўтарытарнага тыпу сацыяльныя сеткі сталі платформай, якая забяспечвае свабоду слова. Прынамсі, у інтэрнэце.

У ЗША я была перакананая, што мая ўцягнутасць у Фэйсбук — уплыў мясцовасці: як-ніяк, Амерыка — радзіма гэтай з'явы. Але вяртанне ў Беларусь дало зразумець: Фэйсбук змяніў характар стасункаў між сацыяльна актыўнай часткай грамадства. У беларускамоўным Фэйсбуку нават была створаная віртуальная дзяржава — Вялікае княства Фацабукі... У дадатак, падчас падзеяў 19 снежня і пасля іх Фэйсбук быў адзінай стужкай навінаў, якая аператыўна акумулявала 100% інфармацыі — смскі з Плошчы, аматарскія відэаролікі, навіны замежных агенцый... У 2006 годзе такую ролю выконваў рэсурс *livejournal*, які сёлета адышоў на другі план, бо ён не такі аператыўны, як сацыяльная сетка. З таго часу, здаецца, маіх сяброў і калег як прыклеіла да Фэйсбуку... Калі адзін беларускі літаратар пры сустрэчы строга звёў бровы і спытаўся, чаму я не «лайкаю» яго кнігу ў Фэйсбуку, я зразумела: пачалося. Па-першае, я вывучыла новы беларускі дзеяслоў «лайкаць» — (адзначаць упадабаную старонку інтэрнэту цэтлікам «Мне падабаецца»). Па-другое, дазналася, што такія «лайкі» падаюць інфармацыю ўверх, прыцягваюць увагу да яе большай колькасці людзей. Гэты літаратар паспяхова прадаў свой новы раман дзякуючы сацыяльным сеткам...

Сацыяльную сетку *«ВКонтакте»* ў народзе празвалі студэнцкай. Тут камунікуе пераважна моладзь. Тут выкладчыкі ўніверсітэтаў ладзяць віртуальныя семінары, мэнэджэры начных клубаў залучаюць наведнікаў на свае імпрэзы... Тут, нечакана для «дарослых», і ўспыхнуў маўклівы супраціў уладзе. Але...

### Фэйсбук-рэвалюцыя?

Хутчэй не, чым так. Калі ў Беларусі адбудуцца палітычныя змены — то яўна не праз папулярныя ў моладзі сацыяльныя сеткі, а проста таму, што наспелі цывілізацыйныя ўмовы для гэтых зменаў. Сацыяльныя сеткі самі па сабе — вялікі пераварот у камунікацыях. Гэта тэхналогія, якая дазваляе маладому музыку сабраць залу на канцэрт, а сарамліваму хлопцу ўпалюваць момант, калі дзяўчына яго мары мяняе свой статус стасункаў на «ўсё складана» і ідзе на гэты канцэрт развеяцца. Але ўсё гэта — адно інструмент для ажыццяўлення афлайнавых мараў і памкненняў. Пратэст пачынаецца ўнутры чалавека, з яго асабістай нязгоды з існым ладам. У Беларусі, як і ў іншых краінах, яго выклікаў эканамічны крызіс (ну і ўвогуле — дастала...) А флэшмоб — сацыяльная з'ява, спароджаная новымі магчымасцямі інфармавання — усяго толькі інструмент данесці свае пратэстныя настроі *urbi et orbi*. Ці ў спрытных руках апынуўся гэты інструмент — пакажа час і практыка. У любым выпадку, моладзевы імпульс мусіў бы быць падхоплены дысідэнцкім лідарам старэйшага пакалення — такім, якім стаў Вацлаў Гавэл для чэшскіх студэнтаў у 1989-м.

### Акадэмік Яўхім Карскі

Філолаг, этнограф, палеограф, фалькларыст. Акадэмік Пецярбургскай (1916) і Чэшскай АН (1929). Праўдзейны член Інстытута беларускай культуры (1922). Двойчы дэмакратычным шляхам абіраўся рэктарам Варшаўскага ўніверсітэта (1905, 1908 гг.). Старшыня камісіі па адкрыцці ў Мінску Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Удзельнік і ганаровы старшыня Усебеларускага з'езда (Мінск, 1917 г.). У сваёй фундаментальнай трохтомнай працы «Беларусы» на падставе глыбокага параўнальна-гістарычнага даследавання мовы, фальклору, пісьменнасці, шматвяковай культуры беларусаў упершыню навукова абгрунтаваў іх нацыянальную самабытнасць як самастойнага народа. Аўтар «Этнаграфічнай карты беларускага племені. Беларускія гаворкі», з якой у беларускім мовазнаўстве пачалася новая навука — лінгвістычная геаграфія. Узнагароджаны Ламаносаўскай прэміяй (1901 г.), залатым медалём Рускага геаграфічнага таварыства (1894 г.) залатым медаль імя К. М. Бацюшкава(1892,1902), прэміяй імя Бацюшкава (1910) і імя В. В. Ахматава (1913) і інш.

КРАЯЗНАЎСТВА

# МАЛАЯ РАДЗІМА АКАДЭМІКА КАРСКАГА

Алесь КРОЙ

**У студзені споўнілася 150 гадоў з дня нараджэння акадэміка Яўхіма Карскага. 29 красавіка — 80 гадоў з дня яго смерці. 5 мая — народзіны вядомага даследчыка-краязнаўца і настаўніка Апанаса Цыхуна — стваральніка музея Яўхіма Карскага і прадаўжальніка яго справы. Да гэтых юбілейных датаў прымеркаваў свае нататкі адзін з паплечнікаў Апанаса Цыхуна — старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі ТБМ імя Ф. Скарыны, былы настаўнік школы-гімназіі №30 Гродна, краязнаўца Аляксандр Крой.**



Фота Аксаны Савашынскай

На радзіме Я.Карскага. Лашанская Свята-Мікалаеўская царква




Лаша. Гродзенскія краязнаўцы і студэнты ГрДУ каля будынка, дзе знаходзіўся першы музей Я.Карскага (1964—1992)

## Вёска Лаша

Вёска Лаша знаходзіцца ў 7 кіламетрах ад шашы Гродна — Ваўкавыск над рэчкай Лашанкай. У пісьмовых крыніцах згадваецца пад 1539 годам, калі яна была валасным сялом. У Пісцовай кнізе Гродзенскай эканоміі напісана, што ў Лашы ў XVI стагоддзі ўжо існавала царква св. Міколы і згадваецца святар Андрэй. Пазней царква стане ўніяцкай, а ў 1839-м зноў ператворыцца ў праваслаўную.

Назва вёскі, па версіі В. Жучкевіча, паходзіць ад старой назвы прытока Свіслачы Лахвы, сёння рэчка Лашанка. Ёсць таксама версія даследчыка Яшкіна «лаша» — пустое, голае месца. У Лашы пражывае каля 220 чалавек, з іх пенсіянераў — каля 70. У часы Другой сусветнай вайны 29 жыхароў вёскі загінулі. У вёсцы Лаша вучыліся адзін з праваднікоў дзяржаўнай палітыкі беларусізацыі першы міністр асветы БССР Антон Баліцкі і герой СССР генерал арміі Міхаіл Грыгаровіч.

## Род Карскіх-Навіцкіх

Пасля заканчэння ў 1857 годзе Гродзенскага духоўнага вучылішча ў Лашы быў назначаны дзячком шаснаццацігадовы Фёдар Мікалаевіч Навіцкі. Воляй лёсу ён пазнаёміўся з дачкой мясцовага дзячка Ануфрыя Вікенцьевіча Карскага, род якіх у Лашы з'явіўся ў пачатку XIX стагоддзя з прыбыццём сюды Вікенція Карскага. Знаёмства Фёдара з Магдалінай Карскай з цягам часу перарасло ў каханне, а ў снежні (стары стыль) 1860 года ў іх нарадзіўся сын Яўхім. Яго прозвішча запісалі па маці. Пазней у іх нарадзіліся яшчэ 4 сыны (Мікалай, Іван, Аляксандр, Уладзімір) і дзве дачкі (Марыя і Вера). Па апошніх даследаваннях стала вядома, што сям'я Навіцкіх-Карскіх у 1862 годзе з'ехала з Лашы ў Барысаўскі павет (сяло Бычa). Сям'я шмат вандравала па царкоўных прыходах.

Брат Яўхіма Мікалай працаваў у банку Растова. Іван быў святаром Мінскага павета ў Блячыне, дзе ў 1920 годзе выпадкова з Карскімі-Навіцкімі (Яўхімам і Іванам) пазнаёміўся гімназіст, будучы вядомы паэт Новік-Пяюн. Брат Аляксандр быў начальнікам руху Варшаўскай чыгункі, напісаў падручнік для інжынераў-чыгуначнікаў. Сястра Вера — замужам у Таліне. Марыя — замужам за святаром у Менскім павеце. У Волме пад Мінскам у 1902 годзе памерла Магдаліна Карская — маці Яўхіма. Бацька Фёдар памёр праз 16 гадоў, у 1918-м, і пахаваны каля царквы Бутча Слуцкага павета (сёння Ганцавіцкі раён). Новыя звесткі пра бацькоў і дзяцей Карскіх-Навіцкіх з'явіліся толькі ў 2007–2008 гадах дзякуючы дырэктару Клецкага гісторыка-этнаграфічнага музея А. Блінцу і праўнуку Яўхіма Карскага — А. Карскаму.

## Памятныя мясціны

У вёсцы яшчэ адчуваецца дух Карскіх, захаваліся месцы і памяць, звязаныя з іх жыццём. Лаша — старадаўняя беларуская вёска з адметнай беларускай культурай, мовай, традыцыямі, якія вывучаў і запісваў Іван Ануфрыевіч Карскі, дзядзька Яўхіма па маці. Сям'я Карскіх аказала ўплыў на станаўленне малога Яўхіма. Дзядзька будучага акадэміка атрымаў духоўную адукацыю. Спачатку працаваў настаўнікам, а потым на працягу 47 гадоў служыў дзячком у розных цэрквах Гродзенскай губерні. Ён паўсюль збіраў фальклорныя і этнаграфічныя матэрыялы і адсылаў іх П. В. Шэйну, вядомаму этнографу. На лашанскіх могілках Іван Карскі ў 1880 годзе паставіў помнік сваім суродзічам, які захаваўся да нашых дзён. Побач стаіць і помнік самому Івану Ануфрыевічу Карскаму.

Напрыканцы 1990-х гадоў з ініцыятывы А. Цыхуна і гродзенскіх валанцёраў, месца пахавання Карскіх па маці было адноўлена ў належным стане. У рэстаўрацыі помнікаў могілках Івана Карскага і яго родных зноў дапамог старшыня калгаса імя Дзяншчыкова Васіль Свірыд, праз падтрымку якога ў 1992 годзе была выдадзена кніга А. Цыхуна «Акадэмік з вёскі Лаша».

## Знакі памяці

Падчас шматлікіх экспедыцый Карскі аб'ехаў больш сотні мястэчак і вёсак, вывучаючы асаблівасці беларускай мовы і межы яе распаўсюджання. Працуючы ў Варшаўскім універсітэце, час летняга адпачынку звычайна праводзіў разам з сям'ёй каля Нёмана (Мігова, Панямунь), там ён адпачываў і працаваў. Пісаў лісты вядомым людзям, сябрам. Захаваліся звесткі, што з Мігова 21 чэрвеня 1909 года ён адаслаў ліст рэдактару газеты «Наша Ніва» А. Уласаву.

На малой радзіме Карскага ў вёсцы Лаша захаваўся будынак, дзе працаваў у мясцовай школе першы музей Карскага. Напачатку 1990-х школа і музей у Лашы былі зачынены. Пасля надання гімназіі №1 (раней школа-гімназія №30) у Гродна імя Яўхіма Карскага, было вырашана стварыць новы музей. З 1995 годзе ў гімназіі №1 працэ аднаўлены музей Карскага, які ў тым ліку арганізуе экскурсіі па мясцінах, звязаных з жыццём і творчай дзейнасцю акадэміка. У музеі Луцкаўлянскай школы захоўваюцца рэчы акадэміка, перанесеныя з музея ў Лашы.

У Гродна імя Карскага носіць вуліца, а таксама абласная бібліятэка, якая адзначыла свае 180-годдзе. Ва ўніверсітэце адбываюцца міжнародныя Карскія чытанні. У 1990 годзе ўрад Беларусі ўсталяваў 8 стыпендый імя Яўхіма Карскага.

На Карскія чытанні прыязджаў з Санкт-Пецярбурга праўнук акадэміка Аляксандр Карскі, які сур'ёзна заняўся вывучэннем спадчыны прадзеда, склаў поўны спіс яго прац, рыхтуе пра яго кнігу. Новую і вельмі цікавую інфармацыю пра Я. Карскага і яго родных знайшоў дырэктар Клецкага музея Андрэй Блінец.

## Краязнавец Апанас Цыхун

Але што б мы ведалі пра жыццё і творчасць акадэміка Карскага, пра яго родных, каб не даследчык-краязнаўца Апанас Цыхун? Нарадзіўся ён у суседняй з Лашай вёсцы Кунцаўшчына. Рана памерла яго маці, з маленства яму прыходзілася працаваць, каб дапамагчы сям'і. Аднойчы, праязджаючы на возе з сенам праз вёску Лаша, бацька прыпыніў каня і кажа: «А ці ведаеш, сынку, што ў гэтай Лашы нарадзіўся хлопчык, Яўхімам клікалі. Калі вырас, дык стаў вялікім вучоным, напісаў шмат розных кніжак. Пра яго і бацюшка ў царкве казаў».

Бацькавы словы запомніліся і — так атрымалася — вызначылі матывацыю ці не галоўнай справы жыцця Апанаса. Ён закончыў Лашанскую школу, куды вярнуўся ўжо настаўнікам пасля атрымання дыплома Гродзенскага педінстытута. Яшчэ студэнтам даведаўся ад выкладчыка беларускай мовы спадара Гурло адрас дачкі Я. Карскага. Напісаў ёй ліст, атрымаў першае фота свайго земляка і зрабіў у школе невялічкі куток, прысвечаны Яўхіму Карскаму. Потым і ўнучка з Ленінграда дашле новыя фота і дакументы.

Аднойчы Лашанскую школу наведае вядомы вучоны з Мінску Фёдар Янкоўскі і натхніць Апанаса Цыхуна на стварэнне сапраўднага музея Карскага, які і адкрыўся 19 снежня 1964 года. Праісцуе гэты музей да 1992 года, калі з-за малакамплектнасці будзе зачынена Лашанская школа.

Варта адзначыць уклад былых і сённяшніх настаўнікаў Лашанскай школы і Гродзенскай гімназіі №1(школа-гімназія №30) — Т. Еўтух, В. Шарову, загадчыц музея Н. Якімовіч і І. Прытульчык, педагога і дырэктара Лашанскай школы (1979–1986) С. Трафімава, загадчыка музея ў Луцкаўлянах У. Козырава, дырэктара Клецкага музея А. Блінца, вучоных А. Майсяёнка і М. Канюшкевіч, былых вучняў школы ў Лашы і гімназіі №1 Гродна, якія па драбніцах збіралі інфармацыю і матэрыялы для музея славутага вучонага.

У 2006 годзе была адкрыта новая пашыраная экспазіцыя музея Я. Карскага ў новым памяшканні. Дзякуючы куратару музея В. Карнелюку, у памяць аб стваральніку першага музея ў Лашы і натхняльніку ў стварэнні новага музея ў Гродна быў урачыста адкрыты і асобны стэнд А. Цыхуну. Адзін з нешматлікіх заходнебеларускіх інтэлігентаў, які пакінуў глыбокі след у духоўнай спадчыне Прынямоння. Шматгадовы даследчык жыццёвага і творчага шляху Карскіх, збіральнік скарбаў народнай мовы Гродзенскага раёна. Яго першая кніга пра Я. Карскага выйшла толькі ў гады незалежнасці ў 1992 годзе, калі аўтару было 82 гады, апошняя — пятая, «Пройдзеныя шляхі-пуцявіны», — у 2003-м.

Літаральна пару месяцаў не дажыў А. Цыхун да свайго 95-годдзя. Яшчэ пры жыцці ён стаўся амаль легендай у справе асветніцка-краязнаўчай дзейнасці, у захаванні духоўнай спадчыны. Вёў перапіску з роднымі Я. Карскага, з вучонымі Б. Кітам, Ф. Янкоўскім, пісьменнікамі В. Быкавым, Я. Брылём, Н. Гілевічам і інш. Пісаў вершы, граў на скрыпцы, выдатна спяваў, займаўся пчалярствам.

Народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч яшчэ пры жыцці Апанаса Пятровіча вельмі ацаніў яго непаўторную, у трох тамах, кнігу «Скарбы народнай мовы», матэрыялы для якой збіраў 40 гадоў. Гэтую працу Гілевіч назваў подзвігам настаўніка. Навуковы рэдактар гэтай кнігі прафесар П. Сцяцко адзначыў, што мала хто з вядомых дактароў навук можа параўнацца з Апанасам Цыхуном такім вялікім укладам у скарбніцу беларускай культуры. Самарод-даследчык, ён прадоўжыў справу свайго земляка Яўхіма Карскага.

ВЫСТАВА



# AETERNUS ET MOMENTUM

Аляксей ХАДЫКА

**Яшчэ за некалькі дзён да афіцыйнага адкрыцця выставы-праекта «Aeternus et momentum» Андрэя Бусла ў Галерэі «Ў» мінакі былі заінтрыгаваныя.**

Безаблічны плот, які цягнецца ад галерэі ў бок новага праспекта Машэрава, пачаў пераўтварацца. Спачатку на вялікіх няправільнай формы плямах тынкоўкі (памерам па 2–3 квадратных метры) на сцяне паўсталі фрагменты тыповых вулічных графіці — з бессэнсоўнымі надпісамі і вобразамі заходняй поп-культуры (з коміксаў, мульцікаў). А потым у вялікіх разрывах паміж плямамі ўзніклі фрагменты задуменна-паэтычных фрэсак ранняга італьянскага Адраджэння.

Менавіта ў пераасэнсаванні ролі і прызначэння класічнай жывапіснай спадчыны Адраджэння ў тэхніцы street-art, унясенні яе ў гарадское асяроддзе побач з вобразамі вулічнай культуры — сутнасць праекта мастака Андрэя Бусла. Па 22 ліпеня мінчукі змогуць пазнаёміцца з ідэямі мастака як побач з галерэяй, так і непасрэдна ў выставачнай прасторы ў інтэр'еры. Адзначым, што ў сярэдзіне экспануюцца не самі творы, а іх вялікія здымкі ці эскізныя праекты будучых прац. Узоры таго, як класічныя работы Гуга ван дэр Гуса, Бацічэлі, Мікеланджэла, Вермеера ці іншых мэтраў маглі б увайсці ў брутальнае асяроддзе сучасных урбаністычных трушчоб. І ведаеце, гэта глядзіцца цікава, гэта захоплівае — як калісьці захоплівала брутальная Берлінская сцяна, пераўвасобленая мастакамі ў арт-аб'ект.

Па-майстэрску арганізавалі і прастору экспазіцыі, удала падзяліўшы яе на асобныя зоны модульнымі сценкамі і надаўшы закуткам своеасаблівую атмасферу праз эфекты асвятлення. Атрымаўся цалкам сучасны ды яшчэ сацыяльна значны мастацкі праект. Вечнае і імгненнае спалучылася — як дэкларуе назва выставы.

15 ліпеня Парк Чалюскінцаў (танцпляцоўка) 18:00
AFISHA.TUT.BY
т. 6490888
ГРУНВАЛЬДЗКІ
UNIA
2011
КАШЛАТЫ BOX
ФЭСТ
ОМУТ
ROSY
TESTAMENTUM TERRAE
ROKASH
прэзентацыя альбома «Запалі Агонь»
СЯРЭДНЯВЕЧНЫЯ ТАНЦЫ, РЫЦАРЫ, КОНКУРСЫ І ІНШЫЯ ЦІКАВОСТКІ!

www.belmusic.org
AFISHA.TUT.BY
Наша Ніва

ЦІКАВА

# ВІРТУАЛЬНЫ СЭКС З ФЮРЭРАМ

Андрэй РАСІНСКІ

**Хворыя на СНІД, скінхэды-аматары і канскія рэжысёры ўсё часцей становяцца ахвярамі сэксу з Адольфам Гітлерам.**

Гітлер памёр. Фюрэр Трэцяга Рэйху атруціўся разам з Евай Браўн і аўчаркай Блондзі. Але вусатыя істэрычныя вобразы нікуды не падзеліся: яны захраслі ў бункеры, стаіліся на задворках культуры — і час ад часу заяўляюць пра сябе скандальнымі правакацыямі з любоўным падтэкстам.

Самы паказальны прыклад — вэрхал у Германіі вакол сацыяльных ролікаў, прысвечаных СНІДу. Ролік — па сённяшніх маральных мерках — звычайны. Легкадумная асоба прыводзіць да дому кавалера, які ўсяляк прагне яе. Ногі, рукі, скінутыя шаты. Калі мілошчы даходзяць да піку, нам паказваюць твар спакушальніка — Гітлера, — які апантана заняты справаю. З'яўляецца надпіс: «СНІД — масавы забойца!»

ВІЧ-інфікаваныя ўголас абурэліся: віртуальны сэкс з фюрэрам, няхай у папераджальна-застрашвальных мэтах, — гэта гнюснае вычварэнне, якое абражае іх гонар і годнасць.

Кампанію Адольфу Гітлеру ў антыСНІДаўскай рэкламе склаў Сталін, які таксама заражаў няшчасных хворых у другім сацыяльным ролiку; але ягонае з'яўленне без парткоў не выклікала такога абурэння ў нямецкіх бюргераў.

Два дыктатары ўжо аднойчы былі «салодкаю парачкай». Па падпісанні пакту Молатава-Рыбентропа ў амерыканскай газеце «Вашынгтон Стар» з'явіўся твор Кліфарда Бэрымана, прысвечаны знакавай падзеі. Жаніх-фюрэр вядзе да алтара нявесту — Сталіна ў шлюбнай сукенцы, які ззяе ад шчасця. Малады — сама ўважлівасць і элегантнасць. У руках вусатай маладой — букецік з кветкамі. Святочны торцік у кутку малюнка ўпрыгожаны свастыкамі і сярпом з молатам.






«Цікава, колькі падоўжыцца мядовы месяц?» — задае нетактоўнае пытанне аўтар карыкатуры.

У хуліганскім фільме 1971 года «В.Р. — Містэрыя арганізму», пастаўленым Душанам Макавеевым, фюрэр і бацька знітаваныя ў мантажы з сэксуальнымі экстазамі і крыкамі вар'ятаў, але мужчынскую партыю вядзе Гітлер. А ў апавяданні Юрыя Нагібіна з цыклу «Каханне павадыроў» Сталін хавае ў ложку партрэт Адольфа.

Як ні дзіўна, Сталін быў не супраць такога сямейнага раскладу. Калі Рыбентроп перадаў яму палкае прывітанне: «Хайль Гітлер!», то павадыр паступіў як добра адукаваная дама — зрабіў глыбокі кніксэн.

Затое сюррэаліст Сальвадор Далі бачыў у Гітлеры жанчыну — і шалеў ад шчасця: «Я быў цалкам зачараваны мяккай, пульхнай спіной Гітлера, якую так добра абліпаў нязменны тугі мундзір. Кожны раз, калі я пачынаў маляваць скураную партупею, якая ішла ад рамяня і, нібы шлейка, абдымала процілеглае плячо, мяккая падатлівасць гітлераўскага цела, што праступала пад ваенным кіцелем, прыводзіла мяне ў сапраўдны экстаз. Пульхнае цела Гітлера, якое ўяўлялася мне найбоскім жаночым целам, абцягнутым бездакорна беласнежнай скурай, рабіла на мяне нейкі гіпнатычны ўплыў».

Далі, які выдатна прадаваў скандалы, зрабіў са сваёй яўнай ці прыдуманай пяшчоты да фюрэра чарговы гандлёвы брэнд, растыражаваны ў карцінах.

А вось герою камедыйнае кінастужкі Іржы Менцэля «Я абслугоўваў англійскага караля» не пашанцавала. Ягоная жонка — зацятая нацыстка, якая салютуе партрэту фюрэра ў шлюбную ноч; а ў сама адказны момант яе твар пераўтвараецца ў фюрэрскі (што маладога не радуе).

У больш зручныя абставіны трапіў «Саламон з Гітлер'югенду» (фільм вядомы як «Еўропа, Еўропа»; і пастаўлены ён па рэальных успамінах). Хлопчыка спакусіла нацысцкая чыноўніца, уявіўшы сабе, што гэта Гітлер.

Непрыхаваную пажаду да фюрэра дэманструе скінхэд у карціне «Дагала» манернага авангардыста (і па сумяшчальніцтве гей-парнографа) Бруса ЛяБруса. Голены акцёр-недарэка проста задавальняецца на партрэт куміра.

Але звычайна віртуальны сэкс з фюрэрам не такі адкрыты. Ён абмяжоўваецца яўнай — а часцей піярнай — прыязнасцю і сімпатыямі, што для скандалу з «прэзідэнтам і канцлерам» зусім дастаткова. Апошняй ахвярай такога вэрхалу стаўся Ларс Трыер, які няўдала паздзекаваўся з журналістаў, якія на канскай прэс-канферэнцыі задавалі яму тупыя пытанні.

Гітлер, ад якога прагнулі зацяжарыць фройлян Трэцяга Рэйху, згарэў амаль 70 гадоў таму. Але бурны віртуальны сэкс з гэтай асобай свецчыць, што стод дасюль не спалены. Ён стаіўся і чакае чарговых палкіх заўзятараў.

# ВАНДРОЎКА Ў ПОШУКАХ ІДЫШ

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**Аматары гісторыі і культуры Беларусі запрашаюць на экскурсію-канцэрт па слядах амаль зніклай цывілізацыі — культуры беларускіх яўрэяў, роднай мовай якіх стагоддзямі быў ідыш.**

Разам з Алесем Астравухам — аўтарам ідыш-беларускага слоўніка і знаўцам габрэйскай культуры — вы наведаеце класічныя заходнебеларускія мястэчкі: Валожын, Вішнева, Івянец, Ракаў.

Вы пабачыце будынкі славутай на ўвесь іудзейскі свет Валожынскай ешывы, цудам захаваных сінагогаў, старажытныя могілкі (і даведаецеся, што напісана на магільных камянях!), помнікі ахвярам Халакосту, радзіму прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль, лаўрэата Нобелеўскай прэміі міру Ш. Перэса, месцы дыслакацыі яўрэйскіх партызанскіх атрадаў у Налібоцкай пушчы.

Вы пазнаёміцеся з незвычайнай і каларытнай мовай ідыш. У выкананні Алеся Астравуха і Аляксея Жбанава пачуеце прыгожыя песні на гэтай мове. Будзе магчымасць спяваць разам! На хутары Барок спадара Алеся Лася прагучыць сапраўдная клезмерская музыка!

Вандроўка стартуе з Мінска 17 ліпеня (нядзеля) а 8:00. Кошт 70 тысяч (уваходзіць экскурсія, канцэрт і пачастунак габрэйскімі

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 743

Падпісана да друку 8.07.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.